Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 131 (6408) | 10 чэрвеня 1939 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

Прывітанне Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР працоўным Башкірскай АССР. (1 стар.).

Узнагароджанне работнікаў прамысловасці Наркамата Узбраення Саюза ССР. (1 стар.).

Сход актыва Маскоўскай арганізацыі ВКП(б). (1 стар.).

Соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: **С. Святлоў** — Як перабудоўвае работу партарганізацыя Наркамзема; **Н. А. Чысты** — Тэрытарыяльная партыйная арганізацыя. Новыя пярвічныя партарганізацыі. Статут партыі ў дзеянні. (2 стар.).

У ДАПАМОГУ ВЫВУЧАЮЧЫМ ГІСТОРЫЮ ВКП(б): **Л. Ліўшыц** — Усеагульная забастоўка бакінскага пролетарыята ў 1914 годзе. (2 стар.).

Табачнік — Месячнік дарожнага будаўніцтва. (2 стар.).

І. Сурага — Прафорг Павел Карповіч. (2 стар.).

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ССЯЛЕННЯ З ХУТАРОЎ У КАЛГАСНУЮ ВЁСКУ!: Нікалай **Дубіцкі** — Перавозяць дамы, не разбіраючы іх; **І. К. Каханчык** — Як мы арганізоўваем ссяленне. (3 стар.).

Р. Фралоў — У тэрмін выпусціць з друку стабільныя падручнікі. (3 стар.).

П. А. Сантаровіч — У Палескай вобласці не захоўваюць совецкія законы. (3 стар.).

ІСПЫТЫ Ў ШКОЛАХ: **Я. ФІРЫН** — Высокія паказальнікі; **С. Каждан** — Выпраўляць недахопы нахаду. (3 стар.).

ЗА РУБЯЖОМ:

Іспанія — італьянскі плацдарм супроць Францыі. Артыкул Чэрчыля. Італія і Англія. Ваенныя дзеянні ў Кітаі. Рашэнне аб арышце Ван Цзін-вея. (4 стар.).

ВА ЎСЕЎЗБРАЕННІ СУСТРЭНЕМ УБОРКУ ЎРАДЖАЮ

На соцыялістычных палях нашай радзімы спее багаты сталінскі ўраджай.

Сказваюцца рэзультаты арганізаванай стаханаўскай работы на палях у час сяўбы. Сёлетняя вясна ўвойдзе ў гісторыю калгаснага будаўніцтва, як вясна высокага класа агратэхнікі і выключнай арганізаванасці калгасных мас.

Але сяўба гэта толькі першы этап барацьбы за ўраджай. Лёс булучага ўраджаю цяпер вырашае догляд пасеваў, падрыхтоўка і своечасовая ўборка.

Нядаўна змешчаная ў газетах пастанова Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза ССР «Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1939 годзе» з'яўляецца баявой праграмай. Яна вызначае канкрэтныя мерапрыемствы, якія павінны забяспечыць правядзенне ўборкі ураджаю ў максімальна кароткі тэрмін, без страт і своечасовае правядзенне загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Пастанова падкрэслівае, што мабілізацыя калгаснікаў, работнікаў МТС і соўгасаў на своечасовы догляд пасеваў, на ўзорную падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю і загатоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў з'яўляецца важнейшай задачай партыйных, совецкіх, зямельных і загатоўчых органаў.

У гэтым годзе чакаецца адначасовае выспяванне яравых і азімых культур. Патрабуецца выключная арганізаванасць. Гэта ўзнімае адказнасць нашых партыйных і совецкіх арганізацый. Трэба памятаць указанні таварыша Сталіна: **«Уборка — справа сезонная і яна не любіць чакаць. Убрай своечасова — выйграў, спазніўся ва ўборцы — прайграў».**

Ёсць у нас усе ўмовы для таго, каб як ніколі арганізавана правесці ўборку ўраджаю. Гэтаму спрыяе выключная насычанасць МТС і калгасаў уборачнымі машынамі. Дастаткова сказаць, што 79 процантаў каласавых і 31,9 проц. пасеўнай плошчы ільну калгасы рэспублікі будуць убіраць машынамі. У гэтым годзе да ўборкі падаткова завозіцца 250 камбайнаў, 130 ільнацерабілак. Багаты калгасны ўраджай будуць убіраць 1.431 камбайн, 1340 ільнацерабілак. Гэта толькі машынамі МТС. Апрача гэтага будуць працаваць 17.540 калгасных жняярак. Новы ўраджай будуць малаціць 2 844 трактарных і каля 19 тысяч конных малатарань.

Прыведзеныя лічбы красамоўна гавораць самі за сябе. Уся справа ў тым, каб правільна расставіць і па-гаспадарску выкарыстаць багацейшы парк уборачных машын.

Прыходзіцца, аднак, адзначыць, што ва многіх раёнах і машынатрактарных станцыях рэспублікі нецярпіма марудзяць з рамонтам ўборачных машын і з правядзеннем іншых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да ўборкі. На 1 чэрвеня толькі 28,4 проц. агульнага ліку ільнацерабілак і 11,1 проц. трактарных малатарань гатовы да ўборачных работ, а па асобных абласцях становішча яшчэ горшае. Напрыклад, па Менскай вобласці гатоўнасць ільнацерабілак да ўборкі складае 17,3 проц.

План рамонту камбайнаў па МТС рэспублікі на 5 чэрвеня выканан на 50,6 проц. — па капітальнаму і на 62 проц. — па бягучаму. Па Гомельскай вобласці план капітальнага рамонту камбайнаў выканан толькі на 35 проц. Больш адной трэці камбайнаў рэспублікі не падрыхтаваны да ўборкі ўраджаю.

У некаторых раёнах кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый самаўхіліліся ад кіраўніцтва падрыхтоўкай да ўборкі. Здзіўляючую бесклапотнасць праяўляюць напрыклад, кіраўнікі Рэчыцкага раёна. У раёне ганебна зрываецца рамонт уборачных машын. У калгасе «Чырвоны Дняпровец» да рамонту нават не прыступілі, машыны знаходзяцца ў безгаспадарчым становішчы, не рыхтуюць свірны. Такое становішча характэрна для многіх калгасаў раёна. Не прадуманы планы ўборачных работ.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР папярэджвае супроць паўтарэння памылак, якія мелі месца пры ўборцы і загатоўцы хлябоў мінулага года. Гэтыя памылкі ў нашай рэспубліцы выразіліся ў нясвоечасовым сканчэнні рамонту камбайнаў, простых уборачных і зерноачышчальных машын і дрэнным іх выкарыстанні. Слаба былі падрыхтаваны механізатарскія кадры, прычым ім не была аказана патрэбная тэхнічная дапамога. У радзе месц не былі пераадолены антымеханізатарскія тэндэнцыі.

У мінулым годзе быў дапушчан вялікі разрыў паміж уборкай, малацьбой і здачай зярна дзяржаве, паміж церабленнем і замочкай ільнапрадукцыі. Не была падрыхтавана патрэбная колькасць сушыльняў, гумнаў, токаў, навесаў. Ясна, што ўсе гэтыя і ім падобныя факты прывялі к вялікім стратам ураджаю, да значнай зацяжкі тэрмінаў уборкі.

У адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР, днямі адбыўшыйся пленум ЦК КП(б)Б абмеркаваў і прыняў адпаведныя рашэнні па пытаннях аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў. Неабходна, не трацячы часу, рашуча ўзняць тэмпы падрыхтоўкі да ўборкі. У адпаведнасці з рашэннямі партыі і ўрада кожная МТС, кожны калгас і соўгас павінны мець і своечасова ажыццявіць план падрыхтоўкі да ўборкі. У ім павінны быць прадугледжаны пытанні падрыхтоўкі кадраў, завяршэння рамонту уборачных машын, інвентара, транспарта, пытанні расстаноўкі людзей і арганізацыі працы, нормы выпрацоўкі і т. д.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове азначылі, што ў мінулым годзе ў арганізацыі загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў мелі месца буйнейшыя недахопы, «галоўныя з якіх заключаліся ў **няправільнай арганізацыі справы аднясення калгасаў да разрадаў ураджайнасці для налічэння натураплаты,** што прывяло да шматлікіх фактаў заніжэння ўраджайнасці ў калгасах і штучнага зніжэння размеру натураплаты».

З гэтых указанняў партыі і ўрада павінны быць зроблены большэвіцкія вывады ў кожным раёне, у кожнай МТС.

Справа чэсці партыйных і непартыйных большэвікоў Совецкай Беларусі—узорна правесці загатоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў. Трэба забяспечыць падрыхтоўку складскіх памяшканняў, своечасовую малацьбу, правільнае скарыстанне аўтатранспарта і спалучэнне яго з жывым цяглом калгасаў і рад іншых мерапрыемстваў, каб своечасова правесці загатоўкі сельскагаспадарчых прадуктаў.

Барацьба са стратамі, барацьба за высокую якасць — галоўнае ва ўборцы. Гэтаму павінны быць падпараджаваны ўсе ўборачныя работы. Разам з гэтым неабходна забяспечыць строгае захоўванне калгаснага ўраджаю ад раскрадвання і псавання.

Зусім нязначны час адзяляе нас ад дня адкрыцця Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Яе мы павінны сустрэць з новымі вытворчымі перамогамі. Узнімем-жа вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай. Ва ўсеўзбраенні сустрэнем уборку багатага сталінскага ўраджаю.

СХОД АКТЫВА МАСКОЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВКП(б)

7 і 8 чэрвеня праходзіў сход актыва Маскоўскай арганізацыі ВКП(б). На сходзе прысутнічала 1.800 чалавек. Пад бурную авацыю сход выбраў у пачотны прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным. З дакладам аб выніках чарговага Пленума ЦК ВКП(б) выступіў сакратар МК і МГК ВКП(б) тав. **А. С. Шчэрбакоў.**

У змястоўным дакладзе, насычаным яркімі прыкладамі, у прыватнасці з практыкі Маскоўскай партыйнай арганізацыі тав. Шчэрбакоў падрабязна расказаў актыву аб рашэннях Пленума ЦК ВКП(б).

— Рашэнні чарговага Пленума ЦК ВКП(б), — гаворыць тав. Шчэрбакоў, — і ў асаблівасці пастанова ЦК ВКП(б) і Совета Народных Камісараў СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» адыграюць велізарную ролю ў далейшым арганізацыйным умацаванні калгасаў, у новым магутным узыме сельскай гаспадаркі і ўсёй народнай гаспадаркі нашай краіны. Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) увойдуць у гісторыю, як новы этап барацьбы ленінска-сталінскай партыі за ўмацаванне грамадскай гаспадаркі калгасаў.

На канкрэтных прыкладах тав. Шчэрбакоў паказаў, што скажэнні сталінскага статута калгаснага жыцця з'явіліся вынікам «няправільнага, небольшэвіцкага кіраўніцтва калгасамі з боку мясцовых, раённых і абласных партыйных і совецкіх арганізацый».

Тав. Шчэрбакоў расказаў таксама падрабязна аб рашэннях Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак с.-г. прадуктаў», «Аб сфарміраванні Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б)» і «Аб правядзенні выбараў у мясцовыя советы дэпутатаў працоўных».

У спрэчках па дакладу тав. Шчэрбакова выступілі тав. Шчэпілаў (інстытут эканомікі Акадэміі навук СССР), тав. Яраслаўскі, тав. Тарасаў (сакратар МК ВКП(б), тав. Бенедзіктаў (народны камісар земляробства), тав. Пронін (старшыня Маскоўскага совета), тав. Пальцэў (старшыня Мосаблвыканкома), тав. Пегаў (сакратар МК і МГК ВЛКСМ), тав. Юдзін (рэдкалегія журнала «Большевик»), тав. Чэчулін (сакратар Раменскага гаркома ВКП(б), тав. Жыдкоў (сакратар Пролетарскага райкома ВКП(б).

У аднагалосна прынятай па дакладу тав. Шчэрбакова пастанове сход актыва Маскоўскай арганізацыі ВКП(б) цалкам і поўнасцю адобрыў рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і заклікаў большэвікоў сталіцы і вобласці па-большэвіцку змагацца за ажыццяўленне гэтых гістарычных рашэнняў. (ТАСС).

ВЫКАНАЛІ ПОЎГАДОВЫ ПЛАН

9 чэрвеня менская скургалантарэйная фабрыка імені Куйбышэва выканала поўгадовую праграму. Выпушчана прадукцыі на 10.532 тысячы рублёў.

Паміж асобнымі рабочымі, цэхамі шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Перадавы на фабрыцы сумачны цэх выканаў сваё поўгадовае заданне за 5 месяцаў. Лепшыя стахановцы тт. Пігулеўская, Савосік, Жукоўская, Лабузова і Меерович даюць па 2—3 нормы за змену.

Калектыў фабрыкі абавязаўся да гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет БССР—26 чэрвеня—выпусціць прадукцыі звыш плана на адзін мільён рублёў.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ІМЕНІ ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

КОМУНІСТЫ—У АВАНГАРДЗЕ СПАБОРНІЦТВА

Калектыў Аршанскага мясакамбіната з чэсцю выканаў свае абавязацельствы, узятыя ім пры ўступленні ў соцыялістычнае спаборніцтва з рабочымі менскага мясакамбіната. Прадпрыемства датэрмінова выканала поўгадовую вытворчую праграму. За пяць месяцаў камбінат выпусціў прадукцыі на 600 тысяч рублёў больш чым у мінулым годзе. Кансервавы цэх ужо выканаў гадавую праграму.

Стаханаўцы камбіната паказваюць добрыя ўзоры работы. У авангардзе спаборніцтва ідуць комуністы і комсамольцы. Комуністы тт. Радкевіч, Пашкевіч даюць па паўтары нормы за змену. Добра арганізаваў работу кішачнага аддзялення майстар тав. Некрасаў. Тут усе рабочыя выконваюць свае нормы.

Стары кадравы рабочы, член партыі тав. Кашырыш, які працуе зараз майстрам у бойна-раздзелачным аддзяленні, перадае свой вопыт маладым рабочым.

Каўбасны цэх (начальнік комуніст тав. Колас) дабіўся добрых рэзультатаў у павышэнні якасці прадукцыі. Каўбасныя вырабы цэха ацэньваюцца не ніжэй 99 балаў.

А. КОРШУНАЎ,
дырэктар Аршанскага мясакамбіната.

ВЫСОКАЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

Датэрмінова скончыўшы 5-месячную вытворчую праграму, рабочыя Барысаўскага шклозавода працуюць у чэрвені з асаблівым энтузіязмам. За першую пяцідзёнку заданне выканана на 105 процантаў.

Спаборнічаючы паміж сабой, многія брыгады дабіліся новых стаханаўскіх перамог. Брыгада па выпуску цвяточніц тав. Курачкіна павысіла сваю выпрацоўку да 160 проц.

Завод працуе зараз над выкананнем адказнага задання па вырабу для Беларускага павільёна Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 24 велізарных рознакаляровых ваз і 35 фанароў (калпакоў) для асвятлення цэнтральнага фасада павільёна.

Эскізы ваз зроблены мастаком тав. Гадлеўскім. Вышыня асобных з іх дасягае звыш аднаго метра, шырыня—60 сантыметраў. 20 такіх ваз ужо гатовы.

СТАХАНАЎСКІЯ ТЭМПЫ

Датэрмінова выканаўшы сваё поўгадовае заданне, калектыў менскай галантарэйнай фабрыкі імені Фрунзе набірае ўсё новыя і новыя тэмпы. Прадпрыемства выпускае штодзённа на 42—43 тысячы рублёў прадукцыі (план 35 тысяч). На 8 чэрвеня 7-месячная вытворчая праграма выканана на 96,5 проц.

Многія стаханаўцы павялічылі сваю прадукцыйнасць. Цыркуляршчык Казей, шліфавальшчык Павел Сахар, паліроўшчыца Кучмель, фрэзероўшчыца Пагосцер і іншыя даюць па 185—290 проц. нормы за змену.

У чэрвені фабрыка значна пашырае асартымент галантарэйных вырабаў. Асвоена вытворчасць ручак для зубных шчотак амерыканскага ўзору. У бягучым месяцы іх будзе выпушчана 25 тысяч штук.

З адыходаў віцебскага шчапінна-шчотачнага камбіната пачалі выпрацоўваць высокаякасныя рознакаляровыя пэлуloідныя гузікі. Вядуцца таксама вопыты над вырабам металічных бручных гузікаў з адыходаў лістапракатнага цэха магілеўскага трубалітэйнага завода. Для масавага выпуску гэтых гузікаў вырабляюцца спецыяльныя штампы.

Да апошняга часу рашоткі — адыходы галаліта—скарыстоўваліся на фабрыцы ў якасці паліва. Зараз з гэтых адыходаў тут выпрацоўваюць маленькія рознакаляровыя гузічкі для жаночага абутку. Масавы выпуск іх пачнецца ў трэцім квартале.

ПОСПЕХІ СКРЭПЕРНЫХ БРЫГАД

ЖЛОБІН. **(Па тэлефону).** На тарфяных палях завода «Лукское» шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за штодзённую здабычу 60 тыс. торфацаглін на кожным скрэперы. 7 чэрвеня ўпершыню ў гэтым сезоне ўсе 8 скрэперных брыгад выканалі сваё заданне.

Лепшая стаханаўская брыгада тав. Сусолкіна дала 62 тыс. 500 торфацаглін, брыгада тав. Гірыловіча — 60.800 (норма 38 тыс.). Адстаючая раней брыгада тав. Ганчарова, якая не выконвала сваёй нормы, у гэты дзень здабыла 43.600 торфацаглін.

У добрай рабоце скрэпернага парка завода вялікая заслуга стаханаўцаў-слесараў. Слесары тт. Еляўза і Цімашкоў аказваюць вялікую дапамогу брыгадам, якія працуюць на скрэперах. Яны хутка знішчаюць усе непаладкі.

Порасоўка скрэпера ў брыгадах тт. Сусолкіна, Гірыловіча, Ганчарова пралаўжаецца не больш — 12—14 мінут. Тут зусім ліквідаваны прастоі.

За ўзорную стаханаўскую працу брыгады тт. Гірыловіча і Сусолкіна дырэкцыяй прэміраваны.

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛАН МЯСАПАСТАВАК

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі, Капаткевіцкі раён на 1 чэрвеня г. г. выканаў план 2-га квартала па мясапастаўках на 106 процантаў, прычым аднаасобнікамі план выканан на 101 проц.

Сакратар РК КП(б) ШТЭЙНБАХ.
Старшыня РВК МІХАЙЛОЎСКІ.
Упаўнаркамзаг ЦАРЭНКОЎ.

Майстар змены Боркавіцкага ільназавода (Дрысенскі раён, Віцебскай вобласці) Марыя Ільнічна Магер, узнагароджаная Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Фото Л. А. Мазелева (Фотахроніка БЕЛТА).

ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БАШКІРСКАЙ АССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР віншуе рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю, усіх працоўных Башкірыі з дваццацігодзьдзем існавання Башкірскай Аўтаномнай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

За 20 год працоўныя Совецкай Башкірыі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дасягнулі велізарных поспехаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. З года ў год развіваецца соцыялістычная прамысловасць, механізуецца калгасная сельская гаспадарка, расце матэрыяльны добрабыт працоўных, мацнее і развіваецца нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу культура.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выказвае поўную ўпэўненасць, што працоўныя Башкірыі прыкладуць усе сілы да выканання вялікага плана трэцяй сталінскай пяцігодкі. Праводзячы няўхільна ў жыццё ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, башкірскі народ і надалей будзе высока трымаць сцяг барацьбы за далейшае ўмацаванне дружбы народаў СССР і разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза, пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, упэўнена пойдзе па шляху да комунізма.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

УЗНАГАРОДЖАННЕ РАБОТНІКАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦІ НАРКАМАТА ЎЗБРАЕННЯ САЮЗА ССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР за выкананне ўрадавых заданняў і асваенне новых узораў узбраення і ўмацаванне баявой магутнасці Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ўзнагароджан 681 работнік прамысловасці Наркамата Узбраення Саюза ССР.

Ордэнам Леніна ўзнагароджана 18 чалавек.
Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджан 71 чалавек.
Ордэнам «Красной Звезды» ўзнагароджана 67 чалавек.
Ордэнам «Знак Почета — 138 чалавек.
Медаллю «За трудовую доблесть» — 162 чалавекі.
Медаллю «За трудовое отличие» — 225 чалавек.

На Совецкай краіне

СОПКА ЗААЗЁРНАЯ — ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА

БІРАБІДЖАН, 8 чэрвеня. (ТАСС). Сёння ў Біраджан прыбылі ўдзельнікі грандыёзнага велапрабега па маршруту сопка Заазёрная — Заходняя граніца СССР. Адважную пяцёрку сустракалі прадстаўнікі партыйных, совецкіх, комсамольскіх і грамадскіх арганізацый, а таксама дэлегацыі прадпрыемстваў і ўстаноў г. Біраджана.

Веласіпедыстам быў уручан рапарт на імя таварыша Сталіна аб становішчы абароннай і фізкультурнай работы ў Яўрэйскай аўтаномнай вобласці.

НА БУДАЎНІЦТВЕ РУДНІКА АК-ЦЮЗ

БУРУЛДАЙ (Кіргізская ССР), 8 чэрвеня. (ТАСС). У невялікай даліне і па схілах гор, парослых густымі цянь-шаньскімі елямі, раскінуліся белыя дамы новага пасёлка, прамысловыя карпусы. Будуецца першы ў Кіргізіі цынка-свінцовы руднік Ак-Цюз. У апошнім квартале гэтага года ён пачне даваць руду Чымкенцкаму свінцоваму заводу. Закончана праходка штольні, пабудаван корпус абагаціцельнай фабрыкі.

Уступіла ў строй гідраэлектрастанцыя магутнасцю 210 кілават, адкрыта сталовая, пабудаваны жыллёвыя дамы для рабочых, інжынераў і тэхнікаў. Дабудоўваецца школа на 280 месц, пякарня, лазня, пральня.

Калектыў будаўнікоў змагаецца за своечасовы пуск рудніка. 87 шахцёраў выконваюць нормы на 140—150 процантаў.

На будаўнічыя работы, якія забяспечаць здачу ў эксплаатацыю першай чаргі рудніка, у бягучым годзе затрачваецца сем мільёнаў рублёў.

ДРЭЙФ «СЕДОВА»

БОРТ ЛЕДАКОЛА «Седов», 8 чэрвеня. **(Радыё спецкар. ТАСС).** Сёння ў раёне дрэйфа «Седова» ідзе снег, тэмпература—мінус 3 градусы. У поўдзень каардынаты 85 градусаў 54 мінуты паўночнай шыраты, 71 градус 55 мінут усходняй даўгаты. Учора днём тэмпература дасягнула плюс 0,5 градуса. За апошнія дні асабліва прыкметна даволі частае хістанне тэмпературы.

На судне ўсё добра.

Н. БЕКАСАЎ.

АРКТЫЧНЫ ПАЛЁТ ГЕРОЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА А. Д. АЛЕКСЕЕВА

У бліжэйшыя дні з Масквы ў Арктыку на самалёце - амфібіі «СССР Н-207» вылятае Герой Совецкага Саюза тав. А. Д. Алексееў. Мэта палёту — перадналвігацыйная разведка, вывучэнне характару і становішча ільдоў па маршруту Паўночнага марскога шляху.

Тав. Алексееву прадстаіць пакрыць на сваім самалёце велізарны паветраны шлях працяжэннем каля 15 тысяч кілометраў. З Масквы «СССР Н-207» накіруецца праз Архангельск у Нар'ян-Мар. Адсюль тав. Алексееў вылеціць на лёдавую разведку ў Карскае мора, а затым у мора Лапцевых. (ТАСС).

НОВЫ МОСТ ПРАЗ ВОЛГУ

КУЙБЫШЭЎ, 8 чэрвеня (ТАСС). Сёння закончана разведвальнае бурэнне ў русле Волгі, пад Ульянаўскам, на месцы будаўніцтва новага вялікага чыгуначнага маста праз Волгу.

Збудаванне плаціны Куйбышэўскага гідравузла ўзніме волжскія воды на 32 метры, і стары мост ва Ульянаўску ўжо не зможа прапускаць пасажырскія і таварныя параходы, ідучыя па рацэ. Новы мост будзе вышэй і даўжэй.

Майстар совецкага планерызма І. Л. Карташоў і чэрвеня зрабіў бліскучы пералёт на планеры «Стахановец» па заданаму маршруту Масква—Горкій. НА ЗДЫМКУ: І. Л. Карташоў ля планера «Стахановец».

Фото В. Іванова (фотахроніка ТАСС).

КІТ ВАГОЮ Ў 105 ТОН

Борт «Алеута», 8 чэрвеня. (ТАСС). Чатыры дні назад ля берагоў Камчаткі гарпунер кітабойца «Авангард» тав. Пургін забіў буйнага кіта. За сем год кітабойнага промысла гэта найбольшы па вазе экземпляр. Даўжыня яго — 18 метраў, вышыня тулава — 4,9 метра, размах хваставых ластаў — 5,25 метра. Вага кіта—105 тон.

На палубу туша была паднята з дапамогаю 7 лябёдак.



Па гарадах Совецкага Саюза. НА ЗДЫМКУ: набяражная імені Сталіна ў сталіцы Грузінскай ССР, г. Тбілісі.

Фото В. Стаханова (фотахроніка ТАСС).

Партыйнае жыццё

ЯК ПЕРАБУДОЎВАЕ РАБОТУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ НАРКАМЗЕМА

У статуце ВКП(б), прынятым на XVIII з'ездзе партыі, вызначаны абавязкі і пярвічных партарганізацый наркаматаў.

Задача наркамацкіх партарганізацый зараз заключаецца ў тым, каб правільна зразумець свае функцыі, узначаліць барацьбу з элементамі бюракратызма і цяганіны, дабіваца своечасовага рэагавання на пісьмы і скаргі працоўных, умацоўваць працоўную дысцыпліну і ў час сігналізаваць і прымаць меры да знішчэння недахопаў у рабоце апарата наркамата.

Гэтыя задачы зусім чотка вызначаны ў статуце ВКП(б), прынятым на XVIII з'ездзе партыі.

«Наркамацкія партыйныя арганізацыі, — гаворыцца ў статуце партыі, — якія, у сілу асобых умоў работы совецкіх устаноў, функцыямі кантролю карыстацца не могуць, абавязаны сігналізаваць аб недачотах у рабоце ўстановы, адзначаць недахопы ў рабоце наркамата і яго асобных работнікаў і накіроўваць свае матэрыялы і меркаванні ў ЦК ВКП(б) і кіраўнікам наркамата».

Таварыш Жданаў у сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б), крытыкуючы парочную практыку асобных наркамацкіх партыйных арганізацый, гаварыў: «Партарганізацыя Наркамзема абмяркоўвала пытанне аб ходзе сяўбы па СССР! Гэта-ж камічна! Як быццам яна можа адсюль улічыць, што робіцца дзе-небудзь на Кубані, у Сярэдняй Азіі па ходу сяўбы, — і дае «дырэктывы».

Гэта крытыка поўнасцю адносіцца і да партыйнай арганізацыі Наркамзема БССР. У практыцы гэтай партарганізацыі пытанні работы апарата, умацавання працоўнай дысцыпліны, палітычнае выхаванне служачых вельмі рэдка ставіліся на сходах партарганізацыі. Затое партком больш займаўся абмеркаваннем пытанняў рэспубліканскага маштаба, якія ніякіх адносін да работы партарганізацыі не мелі. Парадак дня звычайна загружаўся такімі пытаннямі, як: аб рабоце ветэрынарнага ўпраўлення, аб ліквідацыі эпізаатыі ў рэспубліцы, аб развіцці жывёлагадоўлі, падрыхтоўцы да сяўбы і т. д. Прычым, заўсёды у такіх выпадках прымаліся пастановы — «дырэктывы», якія, па сутнасці, падмянялі кіраўніцтва наркамата.

5 студзеня 1939 года партком абмяркоўваў пытанне аб рабоце ветэрынарнага ўпраўлення Наркамзема і ліквідацыі эпізаатыі ў рэспубліцы. У прынятай пастанове даецца такая «дырэктыва»: «Прапанаваць тав. Асмалоўскаму (начальнік упраўлення) у пяцідзённы тэрмін распрацаваць на 1939 год план мерапрыемстваў па ліквідацыі эпізаатыі ў рэспубліцы і, у першую чаргу, анемії, і не пазней 1 лютага давесці да раёнаў... Прыняць найстражэйшыя меры да захавання карантынных правіл у раёнах... Правесці перакідку ўрачоў...» і т. д. Такія прыклады не адзінкавы, іх можна прывесці значна больш.

Трэба сказаць, што і пасля з'езда партыі ў партарганізацыі Наркамзема не намеціўся рашучы пералом у галіне перабудовы партыйнай работы. У гэтай партарганізацыі, як відаць, яшчэ не зразумелі задач, якія стаяць перад партарганізацыяй совецкай установы. Тут пытанні работы апарата, умацавання працдысцыпліны, разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва сярод служачых яшчэ не сталі ў цэнтры ўвагі бюро партарганізацыі.

Нават на партыйным сходзе, пры абмеркаванні вынікаў работы XVIII з'езда ВКП(б), ніхто з выступаўшых комуністаў не гаварыў аб перабудове партыйнай работы і аб канкрэтных задачах партыйнай арганізацыі. Гэтыя пытанні не знайшлі свайго адлюстравання і ў прынятай на сходзе рэзалюцыі. У рэзультаце ў рабоце апарата Наркамзема яшчэ і зараз ёсць многа вельмі сур'ёзных непаладкаў, выпадкі нарушэння працоўнай дысцыпліны, пяганіна і інш.

Вось некалькі прыкладаў. Па нядбайнасці работнікаў экспедыцыі чатыры дні праляжалі важныя матэрыялы з нормамі па рамонту трактараў і сельгасмашын, якія былі прызначаны для рассылкі па абласцях. Па віне работнікаў праекта-каштарыснай групы былі засланы ў адрас райза праекты зернасушылак з дапушчанымі памылкамі.

Асобныя ўпраўленні не выконваюць у тэрмін пастаноў урада і ўказанняў саюзнага наркамата. Паўднёва-занальнае ўпраўленне не выканала пастановы СНК БССР аб ходзе сяўбы па СССР! Гэта-ж камічна! Як быццам яна можа адсюль улічыць, што робіцца дзе-небудзь на Кубані, у Сярэдняй Азіі па ходу сяўбы, — і дае «дырэктывы».

Гэта крытыка поўнасцю адносіцца і да партыйнай арганізацыі Наркамзема БССР. У практыцы гэтай партарганізацыі пытанні работы апарата, умацавання працоўнай дысцыпліны, палітычнае выхаванне служачых вельмі рэдка ставіліся на сходах партарганізацыі. Затое партком больш займаўся абмеркаваннем пытанняў рэспубліканскага маштаба, якія ніякіх адносін да работы партарганізацыі не мелі. Парадак дня звычайна загружаўся такімі пытаннямі, як: аб рабоце ветэрынарнага ўпраўлення, аб ліквідацыі эпізаатыі ў рэспубліцы, аб развіцці жывёлагадоўлі, падрыхтоўцы да сяўбы і т. д. Прычым, заўсёды у такіх выпадках прымаліся пастановы — «дырэктывы», якія, па сутнасці, падмянялі кіраўніцтва наркамата.

Неадкладная задача партыйнай арганізацыі—мабілізаваць гэты калектыў на большэвіцкае выкананне пастановы ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 27 мая 1939 года «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання» і рашэнняў чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б.

С. СВЯТЛОЎ.

Кіраўнік агітколектыва дырэктар Добрушскай сярэдняй школы № 1 (Гомельская вобласць) тав. Кузмянкоў кансультуе настаўнікаў школы па дакладу тав. Жданава на XVIII з'ездзе ВКП(б). Злева направа: Г. Ф. Кузмянкоў, А. І. Кантаровіч, Л. Л. Кунцэвіч, В. П. Барабанаў і А. А. Шэкун. Фото А. Р. Шаевіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

Пярвічная партарганізацыя Жажэлкаўскага сельсавета, Смалявіцкага раёна, правяла значную работу па разъяснению гістарычных рашэнняў XVIII з'езда партыі і даклада таварыша Сталіна сярод калгаснікаў. Для гэтага створан агітколектыў у колькасці 24 чалавек. Агітатары штодня нясуць у масы жывыя словы большэвіцкай праўды, мабілізоўваюць працоўных на выкананне задач, пастаўленых XVIII з'ездам ВКП(б).

У рэзультаце шырока разгорнутай палітычнай агітацыі, партарганізацыя дабілася паспяховага правядзення веснавой сяўбы. Раней адставаўшыя калгасы «Сталінскі набор», «Першы май» высокаякасна закончылі пасеўную кампанію да 7 мая. Партарганізацыя забяспечыла выкананне і іншых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў. За першае паўгоддзе па сельсавету датэрмінова выкананы план мясапаставак і фінансавых плацяжоў.

Сярод агітатараў асабліва вызначаюцца тт. Маркавец, Ермалаеў, Савіцкі, якія вывучэнне рашэнняў з'езда звязваюць з канкрэтнымі задачамі калгаса. Агітатары тт. Ермалаеў і Савіцкі прыняты кандыдатамі ў члены партыі. Вакол партарганізацыі створан беспартыйны актыў. Партыйная арганізацыя ў апошні час усю агітацыйна-масавую работу накіроўвае на ўзорную падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Агітатары раз'ясняюць калгаснікам матэрыялы Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР і пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання».

Н. А. ЧЫСТЫ.

сакратар тэрытарыяльнай пярвічнай партарганізацыі Жажэлкаўскага сельсовета, Смалявіцкага раёна.

НОВЫЯ ПЯРВІЧНЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Партыйнымі арганізацыямі Гомельскай вобласці за перыяд з сакавіка па чэрвень прынята ў члены і кандыдаты партыі 1685 чалавек лепшых людзей прадпрыемстваў, калгасаў і совецкай інтэлігенцыі. За 5 месяцаў сельскімі партарганізацыямі вобласці прынята ў кандыдаты партыі 207 калгаснікаў.

З ростам партыйных радоў паявіліся новыя пярвічныя партыйныя арганізацыі у калгасах і сельсоветах. За гэты перыяд па вобласці створана 75 новых пярвічных партарганізацый, з іх 8 калгасных і столькі-ж сельсоветскіх.

Маладыя партыйныя арганізацыі ўзначалілі барацьбу за высокаякаснае правядзенне веснавой сяўбы, настойліва працуюць пад умацаваннем калгасаў.

Добра працуе партарганізацыя калгаса імені Кірава, Жлобінскага раёна, якая, дзякуючы сістэматычнай масавай рабоце з калгасным актывам, значна вырасла; зараз яна налічвае 13 членаў і кандыдатаў партыі.

Аднак асобныя раёны вобласці вельмі слаба праводзяць работу па ўцягненню лепшых калгаснікаў у партыю. Рагачоўская і Кармянская партарганізацыі прынялі ў кандыдаты партыі ад пачатку года толькі па 10 калгаснікаў, Уваравіцкая і Журавіцкая — па 8 калгаснікаў.

СТАТУТ ПАРТЫІ Ў ДЗЕЯННІ

У адпаведнасці з новым статутам партыі, Сталінскі райком КП(б)Б г. Менска зацвердзіў рашэнні пярвічных партарганізацый станкабудаўнічага завода імені Кірава і скурзавода «Большэвік» аб стварэнні партарганізацый і партгруп у цэхах.

Згодна гэтага рашэння, на заводзе «Большэвік» будуць выбраны бюро цэхавых партарганізацый у першым і другім хромавым цэхах, дзе налічваецца 15—17 членаў партыі. У механічным цэху, дзе ёсць 11 членаў і 8 кандыдатаў партыі, таксама арганізоўваецца партгрупа.

Будуць створаны партгрупы і на заводзе імені Кірава ў шасці вядучых цэхах — такарным, слясарным, стара-механічным, лідейным, інструментальным і кавальскім.

Для забеспячэння аператыўнага кіраўніцтва і лепшай пастаноўкі партыйна-палітычнай работы райком партыі ставіць сваёй задачай арганізаваць партгрупы ў цэхах, па брыгадах, агрэгатах і аддзелах у буйнейшых прадпрыемствах і ўстановах раёна.

МЕСЯЧНІК ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА

Будаўніцтва і рамонт мясцовых дарог мае велізарнае гаспадарчае і палітычнае значэнне. За апошнія годы ў Беларусі пабудаваны сотні кілометраў шасейных дарог. Нямала прасёлачных дарог ператвораны ў культурныя і ўпарадкаваныя магістралі. На гэтую мэту ўрад штогод адпускае вялікія сродкі. Але асігнаваныя грошы не заўсёды поўнасцю скарыстоўваюцца.

Асабліва марудна ідзе будаўніцтва мясцовых дарог і мастоў па Менскай вобласці. Пяцімесячны план па вывазцы будаўнічых матэрыялаў выканан толькі на 15 проц. У большасці раёнаў (Крупскім, Лагойскім, Уздзенскім, Халопеніцкім і інш.) ніякага зруху не наглядалася і ў маі. Аднаасобнікі, як у мінулым годзе так і сёлета, у многіх раёнах вобласці не прыцягваюцца да працоўнага ўдзелу ў будаўніцтве дарог.

Якасць рамонту дарог і мастоў вельмі нізкая. Калеі і ўхабы, што асталіся пасля веснавой паводкі, не зараўнаны. Не ўсюды зроблен водаадвод.

Зусім слаба разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва на дарожным будаўніцтве. Метады работы перадавых калгаснікаў і брыгад не перадаюцца адстаючым.

Менскі, Лагойскі і Пухавіцкі райвыканкомы прымаюць нямала рашэнняў аб будаўніцтве дарог. Аднак яны ні разу не пакантраляваді, як яны выконваюцца. Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі гэтых раёнаў зусім мала займаюцца дарожным будаўніцтвам, не кіруюць гэтым важнейшым участкам работы.

Практыка работы некаторых перадавых раёнаў паказвае, што там, дзе раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі аддаюць будаўніцтву дарог неабходную ўвагу, план з поспехам выконваецца.

Добрым прыкладам у гэтых адносінах можа паслужыць Заслаўскі раён. Тут дарожныя майстры і дзесятнікі сістэматычна раз'язджаюць па сельсоветах, праводзяць масавую растлумачальную работу сярод калгаснікаў. У выніку план вывазкі будаўнічых матэрыялаў для рамонту дарог і мастоў быў выканан. У гэтым раёне ёсць нямала калгасаў («Паліт-аддзел» і інш.), якія выканалі поўнасцю план працоўнага ўдзелу ў будаўніцтве дарог.

У мэтах паспяховага выканання плана вывазкі будаўнічых матэрыялаў і хутчэйшага завяршэння работ на мясцовых дарогах, па рашэнню Менскага абкома КП(б)Б і Оргкамітэта з 1 чэрвеня па 1 ліпеня г. г. абвешчан месячнік па будаўніцтву і рамонту мясцовых дарог і мастоў.

За час гэтага месячніка неабходна поўнасцю вывезці ўсе матэрыялы, пабудаваць не менш 60 проц. мастоў, скончыць бягучы капітальны рамонт усіх мастоў, упарадкаваць усе асноўныя дарогі і праязныя пуці, па якіх будуць перавозіцца ўраджай і дзяржаўныя настаўкі.

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі павінны разгарнуць шырокую палітычна-масавую работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў на своечасовае і поўнае выкананне плана работ па працоўнаму ўдзелу ў дарожным будаўніцтве.

Абкомам КП(б)Б і оргкамітэтам устаноўлен пераходны чырвоны сцяг, які будзе ўручан перадавому раёну, што даб'ецца найлепшых паказальнікаў у выкананні плана работ па дарожнаму будаўніцтву. Апрача таго выдзелена 5.000 руб. для прэміравання лепшых стаханаўцаў і ўдарнікаў.

Дарожнікі Менскай вобласці маюць усе магчымасці своечасова выканаць план дарожных работ. Менская вобласць павінна быць перадавой па дарожнаму будаўніцтву.

ТАБАЧНІК,

галоўны інжынер Менскага аблдорадзела.

ПРАФОРГ ПАВЕЛ КАРПОВІЧ

Больш двух год працуе Павел Фёдаравіч Карповіч прафоргам групы сталяроў вагонзбораччнага цэха менскага завода імені Мяснікова. За гэты час ён ажывіў работу прафсаюзнай групы, якая з'яўляецца перадавой на прадпрыемстве.

З першых-жа дзён Павел Карповіч энергічна ўзяўся за работу. У цэху дрэнна абстаяла справа з разгортваннем сацыялістычнага спаборніцтва, з якасцю рамонтуемых вагонаў. Нерэгулярна збіраліся членскія ўзносы. Прафорг сур'ёзна заняўся гэтымі пытаннямі. У час абедзенага перапынку і пасля работы яго часта можна было бачыць у групе рабочых, жыва гутарыўшым з імі.

— Трэба, таварышы, уключыцца ў спаборніцтва, — заклікаў ён рабочых. — Ды з якасцю пара падцягнуцца. Многа дэфектаў прапускаем у вагонах.

Рабочыя ўважліва выслухалі свайго прафорга. На другі дзень многія з іх прынеслі яму акуратна складзеныя кавалкі паперы.

— Гэта нашы сацыялістычныя дагаворы, — гаварылі рабочыя, перадаючы іх прафоргу.

Карповіч адзін за другім разглядаў дагаворы. У кожным з іх былі канкрэтныя абавязацельствы: перавыканаць месячны план, палепшыць якасць рамонту вагонаў. У канцы месяца, калі былі падведзены вынікі спаборніцтва, аказалася, што многія рабочыя значна павысілі сваю прадукцыйнасць працы, знізілі брак.

Добра пастаўлена ў групе агітацыйна-масавая работа. У час абедзеных перапынкаў праводзіцца чытка газет, вывучэнне рашэнняў VIII пленума ВЦСПС. Нямала ўдзяляе ўвагі тав. Карповіч рабоце грамадскіх арганізацый—МОПР'а, Асоавіяхіма, Чырвонага Крыжа.

Часта многія рабочыя звяртаюцца да прафорга за парадай, за дапамогай.

— Пясвоечасова выдаюцца нам нарады на работу, тав. Карповіч, — звярнулася аднойчы да яго група рабочых.

Прафорг паставіў гэтае пытанне перад майстрам тав. Кобакам і дабіўся быстрага знішчэння такіх з'яў.

Многа ўвагі ўдзяляе прафорг пытанням умацавання працоўнай дысцыпліны. Кожнае нарушэнне — спазненне або прагул — абмяркоўваецца на сходзе ўсёй групы.

І. СУРАГА.

ПАГАРДЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПАТРЭБ ЗАВОДА

У 1935 годзе на магілеўскім скурзаводзе імені Сталіна быў праведзен капітальны рамонт даху заводскага корпуса. Па праекту, новы дах павінен быў складацца з бетонных балак з накрыццём іх торфаплітамі і двума слаямі руберойда. Аднак па волі былога кіраўніцтва Наркаммясцпрома і Наркамлегпрома БССР заводскі дах не быў поўнасцю закончан. Замест двух слаёў руберойда быў укладзен толькі адзін.

Кіраўніцтва завода неаднаразова звяртаўся ў Наркамлегпром БССР і трэст скурана-абутковай прамысловасці за водпускам неабходных сродкаў і матэрыялаў для сканчэння даху. Але ўсе нашы просьбы асталіся без усякага рэагавання. Між тым, дах з кожным днём усё больш і больш разбураецца і ў многіх месцах працякае. Усё гэта ў пэўнай меры пагаршае ўмовы працы рабочых, адбіваецца на якасці прадукцыі.

Калі-ж, нарэшце, Наркамат лёгкай прамысловасці БССР і трэст скурана-абутковай прамысловасці спыняць свае барскія адносіны да патрэб нашага завода?

А. І. ІВАНОЎ,

дырэктар магілеўскага скурзавода імені Сталіна, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

У дапамогу вывучаючым гісторыю ВКП(б)

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА БАКІНСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА Ў 1914 ГОДЗЕ

Дваццаць пяць год таму назад, у пачатку чэрвеня 1914 года (у канцы мая па старому стылю), у Баку ўспыхнула ўсеагульная забастоўка нафтапрамысловых рабочых, «прыкаваўшая да сябе ўвагу ўсяго пролетарыята Расіі» («Гісторыя ВКП(б)», стар. 152).

У 1912—1914 гг. рэволюцыйны рух нарастаў з непераадалімай сілай. У 1914 г. стачкі ў Расіі рабіліся ўсё больш упорнымі, захватвалі больш і больш рабочых мас. У 1912 г., у першы год рэволюцыйнага ўздыму, наступіўшага пасля рэакцыі, баставала больш мільёна рабочых, у наступным — 1913 г. — каля 1.300 тысяч, а ў адной толькі першай палавіне 1914 г. у стачках прымала ўдзел ужо каля паўтара мільёна рабочых.

Стачкі перыяду 1912—1914 гг. насілі яркі палітычны характар, яны працякалі пад баявымі рэволюцыйнымі лозунгамі большэвіцкай партыі: «Дэмакратычная рэспубліка», «8-гадзінны рабочы дзень», «Канфіскацыя ўсіх памешчыцкіх зямель». Пад гэтымі галоўнымі лозунгамі ішла мабілізацыя не толькі рабочых, але і сялян і салдат для рэволюцыйнага націску супроць самадзяржаўя.

Кіруемы вялікай партыяй большэвікоў і яе геніяльнымі правадырамі Леніным і Сталіным, рабочы клас Расіі змятаў з свайго шляху ліквідатараў і трацкістаў, якія выступалі супроць стачачнай барацьбы рабочага класа і прабавалі падмяніць рэволюцыйную барацьбу пролетарыята «петыцыйнай кампаніяй».

Слаўная большэвіцкая партыя ўсё вышэй падымала баявы сцяг барацьбы супроць царызма і буржуазіі. Прадбачанне большэвікоў аб неміпучасці наступлення новага рэволюцыйнага ўздыму збылося. Краіна ішла да новай рэволюцыі.

Забастоўка нафтапрамысловых рабочых Баку была адным з самых яркіх і значных эпізодаў новага рэволюцыйнага ўздыму.

Бакінскі пролетарыят, выхаваны і загартаваны таварышам Сталіным у агні многагадовых класавых бітв, быў заўсёды адным з перадавых атрадаў рабочага руху ў Расіі.

У рэволюцыйным Баку многа год працаваў у большэвіцкім падполлі таварыш Сталін. Тут па яго ўказаннях была арганізавана падпольная большэвіцкая друкарня, выдаваўся рад газет, пракламацый, лістовак. Нават у затачэнні ў Байлаўскай турме таварыш Сталін не спыняў кіраўніцтва работай Бакінскага камітэта партыі і выданнем большэвіцкай газеты «Бакинский рабочий».

У артыкуле «Нарада і рабочыя» (1908 г.) таварыш Сталін так характарызуе значэнне Баку ў агульнарасійскім рабочым руху:

«Першая агульная забастоўка ў Баку, —піша таварыш Сталін,—вясной 1903 г., адкрыла сабой вядомыя ліпеньскія забастоўкі-дэманстрацыі паўднёвых гарадоў Расіі; другая агульная забастоўка ў лістападзе—снежні месяцах 1904 года паслужыла сігналам слаўных студзеньска-лютаўскіх выступленняў па ўсёй Расіі; у 1905 годзе, адразу аправіўшыся ад армяна-татарскай разні, бакінскі пролетарыят ўрываецца ў бой, заражаючы сваім энтузіязмам «увесь Каўказ»; з 1906 года, пасля адступлення рэволюцыі, Баку ўсё-такі не «ўнімаецца» і штогод лепш, чым дзе-б то ні было ў Расіі, святкуе пролетарскую маёўку, выклікаючы ў іншых гарадах пачуццё благароднай зайздрасці» (гл. Л. Берыя. «Да пытання аб гісторыі большэвіцкіх арганізацый у Закаўказзі». 4-е выд. Дзяржпалітвыдат. 1938. Стар. 142). «Баку, — гаворыць тав. Берыя,— ператварыўся ў аплот закаўказскіх большэвіцкіх арганізацый, у несакрушальную крэпасць ленінскай партыі... Слаўныя большэвіцкія традыцыі, прывітыя самым блізкім сараткікам вялікага Леніна — таварышам Сталіным, высунулі бакінскі пролетарыят у рады перадавых барацьбітоў за перамогу рэволюцыі, за дыктатуру пролетарыята, за перамогу сацыялізма (тамжа, стар. 140 і 192).

У 1904 г. бакінскі пролетарыят у цяжкай барацьбе з капіталістамі-нафтапрамыслоўцамі ўпершыню ў гісторыі рабочага руху ў Расіі дабіўся заключэння калектыўнага дагавору паміж рабочымі і прадпрыемцамі. Аднак, пасля паражэння рэволюцыі 1905 г. гэты дагавор быў фактычна ануліраван буржуазіяй. Эксплаатацыя рабочых на промыслах дасягнула крайніх межаў.

У канцы 1909 г. бакінскі пролетарыят адзін з першых у Расіі падняўся на барацьбу супроць наступлення буржуазіі.

У ліпені 1913 г. у Баку пачалася падрыхтаваная большэвікамі ўсеагульная забастоўка бакінскіх рабочых. Рабочыя патрабавалі скарачэння рабочага дня, павелічэння заработнай платы, прызнання профсаюзаў, права святкавання 1 Мая і інш. Царскаму ўраду і буржуазіі ўдалося тады ліквідаваць стачку бакінскіх рабочых. Кіраўнікі стачкі — большэвікі—былі арыштаваны. Бакінскі пролетарыят не накапіў яшчэ к таму часу дастаткова сіл для сур'ёзнага адпору царызму і буржуазіі.

У пачатку 1914 г. бакінскі пролетарыят, даведзены капіталістамі да крайняй ступені нішчаты, голаду, знясілення, пачаў пад кіраўніцтвам большэвікоў рыхтавацца да новай стачкі.

Большэвікі прарабілі вялікую работу па згуртаванню бакінскага пролетарыята, па арганізацыйнай і матэрыяльнай падрыхтоўцы забастоўкі. У сярэдзіне мая быў створан забастовачны камітэт, цесна звязаны з промыслами і заводамі.

23 мая (па старому стылю) забастовачны камітэт быў арыштован. Але гэта ўжо не магло спыніць руху.

Утварыўся новы забастовачны камітэт. 26 мая ён выпусціў адозву, у якой патрабаваў вызвалення арыштаваных членаў забастовачнага камітэта і заклікаў рабочых да забастоўкі. У сваёй адозве забастовачны камітэт пісаў: «Менш года прайшло з часу ліпеньскай забастоўкі, а становішча наша ніколькі не палепшылася... Многае нам нашымі гаспадарамі ў тую забастоўку наабяцана, многае зноў ўзята назад. Яшчэ больш нашых патрабаванняў не было выканана зусім».

28 мая (10 чэрвеня новага стылю) забастоўка пачалася.

Побач з чыста эканамічнымі патрабаваннямі былі высунуты лозунгі: «Далоў самадзяржаўе!», «Няхай жыве социялізм!».

Устрывожаны стачкай, начальнік бакінскага жандармскага ўпраўлення даносіў у Пецербург: «Сёння ў бакінскім прамысловым раёне рабочыя аб'явілі забастоўку, прад'явіўшы эканамічна-палітычныя патрабаванні. Настрой рабочых павышаны».

З першых-жа дзён стачкі бакінскія рабочыя паказалі ўзор арганізаванасці і пролетарскай згуртаванасці. Стачка ахапіла звыш 30.000 чалавек.

Грандыёзнае выступленне бакінскіх рабочых выклікала вялікую трывогу і замяшанне не толькі сярод нафтапрамыслоўцаў, але і ва ўрадзе. Запяжка забастоўкі пры адсутнасці дастатковых запасаў нафты і пры недахвацe вугалю пагражала спыненнем раду галін прамысловасці, Волжскага параходства і інш. Гераічны прыклад бакінскіх пролетарыяў ператвараў забастоўку ў Баку ў забастоўку агульнарасійскага значэння. Тут было ад чаго трывожыцца!

Урад неадкладна пусціў у ход свой улюбёны сродак барацьбы з рабочымі — рэпрэсіі і тэрор. Промыслы былі наводнены казачымі сотнямі, пачаліся масавыя арышты рабочых. Турмы і паліцэйскія ўчасткі не змяшчалі ўсіх арыштаваных. Паліцыя стала насільна прымушаць нафтавікоў да работы, збіваць і нават забіваць рабочых. Нафтапрамыслоўцы па ўгавору з урадам адмаўляліся ўступаць у перагаворы з забастовачным камітэтам. Пачаліся звальненні рабочых.

Аднак рэпрэсіі і тэрор не пахіснулі рэволюцыйнай рашучасці бакінскіх пролетарыяў. Царок'я сатрапы і буржуазія аказаліся бездапаможнымі перад рэволюцыйнай стойкасцю многатысячнай арміі бастуючага бакінскага пролетарыята, арганізаванага і згуртаванага бакінскімі большэвікамі.

20 чэрвеня ў Баку адбылася грандыёзная дэманстрацыя, у якой прыняла ўдзел 20 тысяч рабочых.

Царскі ўрад і буржуазія яшчэ больш разлютавалі. Узмацніліся масавыя звальненні рабочых, якія суправаджаліся патрабаваннем неадкладнага аслабнення прамысловых жыляў.

Павятовы ўчастак міравога суда, прыпыніўшы разбор чарговых спраў, заняўся «разглядам» спраў аб высяленні рабочых з прамысловых жыляў. Штодня назначаліся да слухання сотні спраў, але, па сутнасці, ніякага разбору спраў не было. Па загадзе згатоўленых пратаколах адбывалася масавая выдача нафтапрамыслоўцам выканаўчых лістоў на высяленне рабочых. Адначасова быў аддан загад домаўласнікам не здаваць свае кватэры ў каём рабочым, выселеным з прамысловай плошчы. Рабочых-жа, знайшоўшых сабе кватэры, паліцыя не прыпісвала і затрымлівала іх пашпарты.

Тысячы сем'яў з дзецьмі апынуліся пад адкрытым небам.

Даведзеныя да роспачы, жонкі арыштаваных і зволеных рабочых арганізаванымі масамі накіроўваліся да кантор промыслаў, патрабуючы вызвалення мужоў і спынення здзекаў.

Натоўп жанчын з дзецьмі—каля 300 чалавек — сабраўся ля канторы промысла «Маскоўска-Каўказскага таварыства» і прад'явіў адміністрацыі патрабаванне аб вызваленні іх мужоў, аб задавальненні іх утрыманнем, згодна прад'яўленым рабочымі патрабаванням, і аб прыёме іх мужоў зноў на работу. Жанчыны пратэставалі супроць высялення іх з кватэр і супроць забароны карыстацца піцнявой вадой з калодзежаў.

У адказ на патрабаванне прыстава разыйсціся, жанчыны заявілі, што не крануцца з месца.

«Прысутнічаўшы там з казакамі каманд-зір 3-й сотні Запарожскага палка, — пісаў у сваім данясенні граданачальніку балахана-сабурчынскі паліцмейстар, — распарадзіўся адцясніць жанчын; тады жанчыны падняслі крык і некаторыя з іх, не сыходзячы з месца, садзіліся на зямлю, іншыя-ж сталі кідаць пад ногі коней казакаў сваіх дзяцей, у выніку чаго не прадстаўлялася магчымым прыняць супроць іх якіх-небудзь мер». Далей, паліцмейстэр даносіў, што другая група жанчын сабралася каля мячэці і стала кідаць камнямі ў праходзіўшых міма штрайкбрэхераў, якія вярталіся з промыслаў.

З кожным днём барацьба рабочых з паліцыяй і казакамі прымала ўсё больш вострыя формы. У радзе пунктаў справа даходзіла да барыкад.

З ліпеня ў Баку ў знак салідарнасці з нафтавікамі забаставалі рабочыя друкарняў, літаграфій, пераплётных, кравецкіх майстэрняў, магазінаў гатовай адзежы і т. д. З-за гэтага 4 ліпеня не вышлі буржуазныя газеты «Баку» і «Каспій».

Гераічная барацьба бакінскіх рабочых знайшла гарачы водклік у пролетарыята ўсёй Расіі і перш за ўсё — Масквы і Пецербурга. У знак пратэсту і салідарнасці з бакінскімі рабочымі пачалася стачка ў Маскве, якая перакінулася ў іншыя гарады.

3 ліпеня рабочыя Пуцілаўскага завода ў Пецербургу сабраліся на мітынг пратэсту супроць расправы царскага ўрада з бакінскімі рабочымі. Паліцыя страляла ў сабраўшыхся. Глыбокае абурэнне ахапіла пролетарыят Пецербурга. 4 ліпеня, па заклику Пецербургскага камітэта партыі, там забаставала 90 тысяч рабочых. 7 ліпеня ужо баставала 130 тысяч, 8 ліпеня — 150 тысяч, а 11 ліпеня — 200 тысяч.

Хваля дэманстрацый, мітынгаў-пратэстаў і забастовак пракацілася па многіх іншых гарадах. Рабочыя сабіралі грошы для дапамогі сваім бакінскім таварышам. З Батума, Новарасійска, Масквы, Пецербурга, Лодзі і т. д. у адрас бакінскіх рабочых ішлі сабраныя рабочымі на падтрыманне стачкі грошы.

Бакінскі пролетарыят, натхнёны пролетарскім падтрыманнем рабочых усёй Расіі, прадаўжаў стойка змагацца. Прыехаўшы ў Баку член Дзяржаўнай думы меншавік Скобелеў прабаваў «уладзіць» канфлікт «мірным шляхам». Здрадніцкая вылазка меншавікоў разбілася аб несакрушальную стойкасць бакінскіх рабочых.

У разгар барацьбы ў Баку прыбыў вартавы пёс самадзяржаўя і буржуазіі—таварыш міністра ўнутраных спраў генерал Джункоўскі, камандыраваны ў Баку царскім урадам. Генерал патрэбаваў ад бакінскіх рабочых прыступіць да работы, пагражаючы ўсякімі карамі, але і яго пагрозы не пазбавілі на бакінскі пролетарыят. З гордым спакоем, са здзіўляючай вытрымкай, з непахіснай рашучасцю змагацца да поўнай перамогі бакінскі пролетарыят прадаўжаў сваю гераічную барацьбу.

Бакінскі пролетарыят паказаў, што слаўныя большэвіцкія традыцыі, прывітыя яму вялікім Сталіным, ён захоўвае як баявы сцяг.

Л. ЛІУШЫЦ.

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ССЯЛЕННЯ З ХУТАРОЎ У КАЛГАСНУЮ ВЁСКУ!

* * *

ПЕРАВОЗЯЦЬ ДАМЫ, НЕ РАЗБІРАЮЧЫ ІХ

У дырэктара Лагойскай МТС тав. Цайца яшчэ ў мінулым годзе ўзнікла думка перавозіць хаты з хутароў у калгасны цэнтр, не разбіраючы іх, вярней кажучы так, як хата стаяла на хутары. Але гэта думка ў той час не была ажыццёўлена.

Абмеркаваўшы пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання», калектыў рабочых Лагойскай МТС узяў на сябе абавязацельства аказаць канкрэтную дапамогу ў ссяленні хутарскіх гаспадарак тых калгасаў, у якіх ёсць многа хутароў.

Цяпер таварыш Цайц цвёрда рашыў ажыццявіць свой намер. Ён усё прадумаў. Былі прадугледжаны ўсе дробязі. А потым ён прышоў са сваім планам у райком партыі. Райком адобрыў ініцыятыву тав. Цайца.

4 чэрвеня тав. Цайц, лепшыя трактарысты Кішкуона, Макейчык, Давідовіч і Галавацкі на двух трактарах «ЧТЗ», брыгадзір трактарнай брыгады тав. Тарлецкі на сваім уласным матацыклу і тэхнік-будаўнік райза тав. Зялік прыехалі ў калгас «Рассвет», Прудзішчанскага сельсовета. Іх радасна сустрэлі калгаснікі.

— Мы прыехалі дапамагчы вам ссяляць калгаснікаў у калгасную вёску, — заявіў тав. Цайц. — На трактарах будзем перавозіць вашы хаты, як яны стаяць. Арганізуйце брыгады калгаснікаў. Мы вам дапаможам.

Старшыня калгаса тав. Дрозд хутка склікаў брыгадзіраў, вылучылі на гэту работу калгаснікаў, энергічна ўзяліся за работу.

Першай пачалі перавозіць хату калгасніка Кручонка В. І. Ніхто не верыў, што можна, не разбіраючы і не здымаючы страхі, перавезці хату. А дзед Качан Ігнат сказаў:

— Скарэй мае сівыя валасы вылезуць, чым вы так перавязеце хату. — Для яго ніяк не было зразумела як гэта можна зрабіць.

Работа прадаўжалася. Адны разбіралі печ, другія паднімалі падлогу, трэція рабілі сані, чацвертыя капалі зямлю. Потым пачалі плаўна паднімаць хату на домкратах. Калі ўсё было зроблена, пад хату былі падцягнуты палоззі (звычайныя бярвенні, спераду зачасаныя, каб не цягнулі за собой зямлі). Палоззі спераду на два метры даўжэй хаты. Іх паклалі на тры чвэрці метра вужэй сцен хаты, размеражылы гэту адлегласць аднолькава ад кожнай стараны. Спераду палазы змацавалі бервяном, упушчаным у пазы, і пракруцілі ў палоззях дзіркі для дроту. Дрот разлічан, каб трактар ішоў ад хаты на тры метры. Пасля гэтага паклалі на сані тры бервяны, плаўна апусцілі на іх хату, працягнулі трос. Уся падрыхтоўчая работа закончана. Падвялі два трактары «ЧТЗ» на сцэпку.

Сабралася многа народу, нават з навакольных калгасаў. Іх цікавіла, як будзе перавозіцца цэлая хата.

Загулі маторы. Тав. Цайц, як дыспетчар, падаў сігнал трактарыстам. Ціха кранулі з месца трактары. Дом паехаў.

Некалькі дзесяткаў калгаснікаў, калгасніц на працягу трох кілометраў праважалі перавозку на трактарах хаты ў калгасны цэнтр.

Не разбіраючы, перавезены хаты калгаснікаў Кручонкі, Качана, Муравіцкага, Сарокі, Муравіцкага С. А. і Касоўскага. Апошняя хата — з двух кватэр.

Калгасу «Рассвет» трэба ссяліць 60 хутароў. У гэтым месяцы ўжо перавезена 10 хат, з іх 6 трактарамі. Апрача таго, будуюцца тры новыя дамы. Работы многа. Трэба правільна арганізаваць і расставіць рабочую сілу. Тэмпы з кожным днём будуць павышацца.

Метал тав. Цайца па перавозцы цэлых дамоў каштоўны тым, што ў многа раз эканоміць рабочую сілу, будаўнічы матэрыял, час. Па падліку, для ссялення хаты размерам 9×9 метраў трэба 70 чалавекадзён і 30 конедзён, а пры перавозцы дома трактарам затрачваецца ўсяго 8 чалавекадзён плюс работа трактара.

Па падліках тав. Цайца, можна ў дзень такім чынам перавезці 10 хат, толькі неабходна пастаянная брыгада, якая-б падрыхтоўвала хаты да перавозкі. На перавозку хаты на аллегласць 3—4 кілометры затрачваецца ўсяго 1—2 гадзіны работы трактара.

Вестка аб перавозе цэлых хат на трактары ў калгасе «Рассвет» хутка абляцела ўсе калгасы раёна. 9 чэрвеня ў гэты калгас прыязджаў сакратар Плешчаніцкага райкома партыі тав. Якавіцкі, які, азнаёміўшыся з перавозкай цэлых хат на трактарах, рашыў перанесці гэты вопыт у свой раён.

Зараз стаіць задача—дабіцца перавозкі такім метадам не менш 10 хат у дзень. Ужо арганізавана брыгада з калгаснікаў Слабадскога сельсовета ў колькасці 10 чалавек для дапамогі калгасу «Рассвет». У гэты калгас пасланы два інструктары райкома партыі тт. Усцілоўскі і Косцікаў для правядзення палітмасавай работы і мабілізацыі мас на хутчэйшае сканчэнне работы па ссяленню калгаснікаў.

Нікалай ДУБІЦКІ.

* * *

ЯК МЫ АРГАНІЗОЎВАЕМ ССЯЛЕННЕ

27 калгаснікаў нашай арцелі да 1938 года жылі на хутарах.

У мінулым годзе мы паставілі перад сабой задачу, не паслабляючы работы на калгаснай гаспадарцы, аказаць усямерную дапамогу калгаснікам ссяліцца з хутароў у калгасную вёску. На пасяджэнні праўлення калгаса спецыяльна абмеркавалі гэтае пытанне, склалі план, у якім канкрэтна было ўказана чый і калі перавозіцца дом. Потым вылучылі брыгаду, разбілі яе на тры звяны і далі кожнаму звяну канкрэтнае заданне. Усе звенні адразу пачыналі перавозіць тры дамы. Калі былі перавезены і складзены першыя тры будынкі, звенні ўзяліся за перавозку іншых гаспадарак. У мінулым годзе мы дапамаглі 12 нашым калгаснікам перасяліцца з хутароў у калгасную вёску.

Такім-жа метадам арганізавана ссяленне хутароў у нашым калгасе і сёлета. Зусім за кароткі час мы перавезлі 5 дамоў, у якіх ужо жывуць калгаснікі.

Нам асталося да ўборачнай кампаніі ссяліць у вёску яшчэ 10 калгаснікаў. Мы, безумоўна, узвесяцярым тэмпы гэтай работы. Цяпер самы зручны час для ссялення хутароў. Па-першае, у калгасе няма такой напружанай работы, а па-другое, цяпер цёплае надвор'е і перасяляючымся сем'ям лепш устрайваецца дзе-небудзь жыць, пакуль складуць дом у новым месцы.

Тое, што мы перацягнулі 17 хутароў, намнога ўмацавала працоўную дысцыпліну ў калгасе. Цяпер амаль няма ні аднаго нявыхаду на работу. Калгаснікі, якія жывуць у вёсцы, пачынаюць работу ў 5—6 гадзін. А раней атрымлівалася так, што калгаснікі, якія жылі на хутарах, прыходзілі на работу на гадзіну-дзве пазней астатніх.

Хутка сселім усіх астатніх калгаснікаў, яшчэ лепш наладзім арганізацыю працы ў калгасе, умацуем нашу калектыўную гаспадарку.

І. К. КАХАНЧЫК,
старшыня калгаса «Совецкая Беларусь», Махіроўскага сельсовета, Полацкага раёна.

АДНААСОБНІКІ ЎСТУПАЮЦЬ У КАЛГАСЫ

СМАЛЯВІЧЫ, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Абмеркаванне пастаноў ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб мерах аховы грамадскіх зямель калгасаў ад разбазарвання і аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю выклікала новы прыліў аднаасобнікаў у калгасы. У сельскагаспадарчую арцель «Чырвонае Жодзіна» ўступілі 4 аднаасобныя гаспадаркі, у калгас «Уперад» — 3 гаспадаркі. 8 аднаасобнікаў падалі заявы аб уступленні ў калгас імені Свердлова.

У калгасы раёна за апошнія дні ад аднаасобнікаў паступіла звыш 40 заяў.

СТАХАНАЎЦЫ СЕНАКАШЭННЯ

БРАГІН, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). На калгасных лугах пачалося сенакашэнне. Арганізавана прыступілі да сенаўборкі калгаснікі сельгасарцелі імені Молатава. Тут падрыхтоўка да сенакашэння пачалася адразу пасля веснавой сяўбы. Своечасова была загатоўлена дастатковая колькасць кос, грабель, бабак, малаткоў.

Кіруючыся прамовай тав. Андрэева на XVIII партыйным з'ездзе, калгаснікі перагледзелі нормы выпрацоўкі. Замест мінулагодняй нормы на касца 0,35 гектара ўстаноўлена 0,50 гектара, уведзена індывідуальная адзельшчына. Гэта падняло прадукцыйнасць працы. Калі ў мінулым годзе самая высокая выпрацоўка на касца дасягала толькі 0,50 гектара, то ў гэтым годзе яна дасягае 0,90 гектара. Стаханачы тт. Белянок і Філіпенка Давід выкашваюць у дзень па 0,90 гектара, Філіпенка Даніла і Шарапок — па 0,80 гектара. У калгасе ўжо скошана 50 гектараў сенажаці.

ВЫТВОРЧЫ ЎЗДЫМ СЯРОД ТРАКТАРЫСТАЎ І КАМБАЙНЕРАЎ

БАБРУЙСК, 9 чэрвеня. (БЕЛТА). Ва ўсіх трактарных брыгадах перадавой у Бабруйскім раёне Цялушскай МТС абмеркавана пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1939 годзе».

Пастанова партыі і ўрада выклікала сярод рабочых і спецыялістаў МТС велізарны вытворчы ўздым. Стаханачы і ўдарнікі МТС у адказ на пастанову ўзялі абавязацельства — датэрмінова і высокаякасна закончыць рамонт уборачных машын і інвентара, узорна правесці ўборку.

Знатны камбайнер МТС, кандыдат партыі т. Вяроўкін, які ў 1938 годзе ўбраў 300 гектараў пры норме 200, абавязаўся ў гэтым годзе ўбраць на сваім камбайне не менш 400 гектараў. Тав. Вяроўкін адным з першых у МТС закончыў рамонт камбайна. Выдатна адраманцаваў свой камбайн і стаханачы т. Андрускі, які скончыў у гэтым годзе аддзяленне механізатараў бабруйскай калгаснай школы.

У МТС адрамантаваны ўсе 5 камбайнаў. Дэтальна распрацаваны маршруты камбайнаў на час уборкі. З 5 ільнацерабілак адрамантавана 4. Паспяхова ідзе рамонт малатарань.

Комсамольская арганізацыя племгаса «Крынкі» (Віцебская вобласць) абавязалася к 1 студзеня 1940 г. падрыхтаваць кваліфікаваных трактарыстак-даяўчат. Створан гурток, у якім 9 комсамолак абучаюцца рабоце на трактары. НА ЗДЫМКУ: тэхнік-механік племгаса, комсамолка В. І. Суравенка (злева) абʼясняе гурткоўцам устройства трактара.
Фото В. А. Вернера (фотахроніка БЕЛТА).

НЕ РАМАНТУЮЦЬ УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ

КІРАЎСК. (Спец. кар. «Звязды»). Калгасныя палі напамінаюць зараз букет жывых, рознакаляровых кветак: як лес, шуміць высокае, густое жыта; дружна растуць яравыя хлябы. Чэсная, добрасумленная праца калгаснікаў дае бліскучыя плады.

З вялікай радасцю рыхтуюцца да ўборкі багатага сталінскага ўраджаю калгаснікі сельгасарцелей «Комінтэрн» і «Трэці з'езд Советаў», Казуліцкага сельсовета. Тут поўнасцю адрамантаваны жняяркі, сенакасілкі, малатарні і веялкі. Прыводзяцца ў належны парадак свірны і гумны. Рамантуюцца сярпы і іншы сельскагаспадарчы інвентар. На брыгадных парадах складаюцца і абмяркоўваюцца планы ўборачных работ.

Нядрэнна рыхтуюцца да ўборкі ў сельгасарцелях «Комуніст» і імені XVII партз'езда.

Але ў цэлым па раёну рамонт уборачных машын і сельгасінвентара праходзіць зусім нездавальняюча. Трэба сказаць, што ў раёне своечасова не падумалі аб запасных частках для рамонту ўборачных машын. Калгаснікі даўно ўжо абіваюць парогі раённага склада Белсельгасснаба, але ніяк не могуць атрымаць запасныя часткі для машын. Стаяць неадрамантаванымі 139 конных малатарань, 272 веялкі. Выключную непаваротлівасць праяўляе загадчык склада Сельгасснаба Зімніцкі.

У пастанове «Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1939 годзе» ЦК ВКП(б) і СНК СССР патрабуюць ад партыйных, совецкіх і зямельных органаў хутчэйшага завяршэння падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. З дня апублікавання гэтай пастановы прайшло больш дэкады. Аднак, кіраўнікі раёна да гэтага часу амаль нічога не прадпрынялі, каб рашуча палепшыць падрыхтоўку да ўборкі. Планы рамонту ўборачных машын і іншага сельгасінвентара спушчаны калгасам толькі 7 чэрвеня.

Вялікія страты зярна штогод нясуць калгасы ад свірнавых шкоднікаў. Райза—загадчык т. Наймарк—чамусьці не займаецца пытаннямі падрыхтоўкі складскіх памяшканняў. Ён не даў ніякіх указанняў калгасам аб правядзенні дэзінфекцыі. А між тым ва многіх калгасах яшчэ і зараз не прыступілі да пабелкі і дэзінфекцыі свірнаў і гумнаў.

Недапушчальна зацягнут рамонт сельгасмашын у МТС. Так, у Кіраўскай МТС (дырэктар т. Дамброўскі) з 12 малатарань не адрамантавана ні адна. У Бераснёўскай МТС з 6 камбайнаў адрамантавана ўсяго 2. Асабліва дрэнна ў гэтай МТС з кадрамі. Нехапае 6 штурвальшчыкаў і 8 машыністаў, якія патрэбны для арганізацыі бесперабойнай работы камбайнаў і малатарань.

К. ПЫРХ.

У ТЭРМІН ВЫПУСЦІЦЬ З ДРУКУ СТАБІЛЬНЫЯ ПАДРУЧНІКІ

Заканчваецца вучоба ў школах. Да новага вучэбнага года асталося тры месяцы.

Адным з важнейшых участкаў падрыхтоўкі да новага вучэбнага года з'яўляецца выпуск з друку стабільных падручнікаў. Між тым на гэтым участку становішча яўна нездавальняючае. Па плану, зацверджанаму Наркамасветы БССР, Дзяржаўнае выдавецтва БССР павінна выпусціць у гэтым годзе 83 назвы падручнікаў агульным тыражом у 6.050 тысяч экземпляраў. Выпушчана-ж на сёння з друку усяго каля 25 назваў тыражом каля 2 мільёнаў.

Асноўная прычына такога становішча заключаецца ў тым, што кіраўніцтва выдавецтва (дырэктар тав. Рыпінскі) не праявіла патрэбнай гібкасці для планамернай арганізацыі неабходных працэсаў работы па падрыхтоўцы падручнікаў да друку з самага пачатку года. У рэзультаце значная частка рукапісаў была здана ў набор толькі ў сакавіку—красавіку. Зараз у працэсе набору і карэктурнай праўкі знаходзяцца 28 назваў падручнікаў тыражом у 2.525 тысяч. 7 назваў падручнікаў — у стадыі розных працэсаў рэдакцыйнай апрацоўкі. Сярод іх ёсць і такія, якія марынаваліся ў выдавецтве па 2—3 месяцы. Пропісы, напрыклад, больш двух месяцаў ляжаць без руху ў мастацка-тэхнічным аддзеле з-за непадрыхтаванасці добраякасных клішэ — яны па некалькі разоў перарабляліся. Або ўзяць такі факт. Хрэстаматыя па педагогіцы (частка 1-я) рэдагавалася работнікам выдавецтва тав. Блях каля двух месяцаў, між тым па норме на гэтую работу вызначана 25 дзён. Рукапісы такіх падручнікаў, як «Фізічная геаграфія» (для VII класа) Чэфранава, «Геаграфія часцей свету» (для VI класа) Іванова і «Заалогія» Огнёва з пачатку мая ляжаць у выдавецтве без руху.

Каля 10 рукапісаў падручнікаў яшчэ не паступалі ад аўтараў, хоць тэрміны здачы іх ужо даўно прайшлі. Характэрна, што ніякай матэрыяльнай адказнасці за нарушэнне тэрміну здачы рукапісаў аўтары не нясуць.

Важнейшы ўчастак работы выдавецтва па падрыхтоўцы стабільных падручнікаў для школ не стаў у цэнтры ўвагі партыйнага бюро выдавецтва. Пытанне на сходзе партыйнай арганізацыі не абмяркоўвалася. Асобныя комуністы, якія заняты непасрэдна на рабоце па падрыхтоўцы падручнікаў, не адыгрываюць вядучай ролі. Ёсць факты бездаказных адносін да выканання прамых абавязкаў, у рэзультаце чаго дапускаецца брак у рабоце. Так, рэдактар тав. Хрысцініч пры рабоце над падручнікам Кабанава «Анатомія і фізіялогія чалавека» не ўнёс патрэбных змен у рукапісе па пытанню аб тэрміне адпачынку па цяжарнасці ў адпаведнасці з пастановаю СНК СССР, ЦК ВКП(б) і ВЦСПС. Гэтая памылка была заўважана толькі тады, калі падручнік быў надрукован тыражом у 10.000 экземпляраў. Панесены значныя страты, выпуск падручніка затрымаўся на 8 дзён. Чакат гэты факт не стаў прадметам абмеркавання бюро партыйнай арганізацыі.

Інертныя адносіны кіраўнікоў выдавецтва да выпуску падручнікаў тлумачацца і тым, што яны апынуліся ў палоне нездаровых настрояў. «Паперай, моў, снабжаюць з перабоямі, таму спяшацца няма чаго». Перабоі ў снабжэнні выдавецтва паперай сапраўды ёсць. Але хто, як не самі кіраўнікі выдавецтва вінаваты ў гэтым? Трэба было з пачатку года ставіць пытанне перад адпаведнымі органамі аб бесперабойным забеспячэнні паперай.

Нельга сказаць, што і ў друкарні імені Сталіна зроблена ўсё неабходнае для выпуску ў тэрмін падручніка. Там таксама спасылаюцца на адсутнасць паперы і не прымаюць належных мер да фарсіравання набору. Нямала ёсць фактаў зрыву друкарняй графіка падачы выдавецтву водпіскаў набору для першай і другой карэктуры. Затрымка ў наборы асобных рукапісаў выклікала няроўнамернае паступленне водпіскаў. У рэзультаце гэтага выдавецтва не спраўляецца з праўкай карэктуры ў вызначаны па графіку час.

Для таго, каб ліквідаваць адставанне з выпускам стабільных падручнікаў, трэба неадкладна прыняць усе меры для бесперабойнага снабжэння друкарні паперай. Адпачасова неабходна фарсіраваць падрыхтоўку падручнікаў да друку як па лініі выдавецтва, так і друкарні. Партарганізацыям выдавецтва і друкарні трэба наметіць канкрэтныя мерапрыемствы для таго, каб забяспечыць выпуск падручнікаў у тэрмін.

Р. ФРАЛОЎ.

Іспыты ў школах

ВЫСОКІЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ

Ужо два тыдні 3-я сярэдняя школа гор. Барысава, як і ўсе школы нашай краіны, жыве асабліва напружаным жыццём. Ідуць іспыты—падагуленне і праверка набытых за вучэбны год ведаў. У школе чыста, утульна, на сценах—лозунгі, партрэты правадыроў. У спецыяльна адведзеным пакоі працуе ларок. Вучні апрануты па-святочнаму. Сама абстаноўка напамінае аб урачыстасці.

12 гадзін дня. У VIII класе настаўнік Іосіф Казіміравіч Гайдучэня прыступае да правядзення іспытаў па беларускай літаратуры.

Упэўнена, без хвалявання падыходзіць да стала вучаніца Левіна Ліда. На яе долю (па выцягнутаму білету-пытальніку) выпала адказаць пра значэнне беларускага фальклора, расказаць пра дарэволюцыйную паэму Янкі Купалы «Курган» і даць аналіз верша «Доля батрачкі».

Красачнай мовай, з умелай паслядоўнасцю Ліда дае падрабязны і змястоўны адказ. У заключэнне яна спыняецца на вялікім значэнні, якое надавалі фальклору Ленін, Горкі. Па просьбе асістэнта-настаўніка т. Зомерфельд, Ліда напамяць расказвае верш «Асадзі назад».

«Выдатна» адзначаюць настаўнік і асістэнт.

Вучань Свіршчэўскі Юра расказвае пра творчасць і жыццёвы шлях Якуба Коласа. Умела будуе Юра свае думкі. Надзвычай жывой і багатай мовай дае ён тлумачэнне пра дарэволюцыйныя творы народнага паэта БССР, цяпер ордэнаносца Я. Коласа. Юра таксама атрымлівае выдатную адзнаку.

Асабліва вычарпальныя адказы дала на іспытах вучаніца Левіна Сіма па тэме «вобраз Мацея» з твора Цёткі «Прысята над крывавымі разорамі» і ў аналізе верша Багушэвіча «У астрозе». Яе адказам зайздросцілі многія.

Іспыты паказваюць глыбокія веды вучняў па беларускай літаратуры, уменне разбірацца ў досыць складаных матэрыялах, уменне рабіць поўныя, змястоўныя і правільныя аналізы твораў беларускіх пісьменнікаў.

Я. ФІРЫН.

Выпраўляць недахопы на-ходу

Іспыты ў Коханаўскай сярэдняй школе (Талачынскі раён) праходзяць ва ўмовах агульнага ўздыму ўзроўню ведаў вучняў.

Да гэтага важнейшага перыяду ў вучэбным годзе школа старанна рыхтавалася.

У чацвертай чверці вучэбнага года ўся ўвага настаўніцкага калектыва была накіравана да адстаючых вучняў. Дапамагчы ім падцягнуцца, аказаць ім неабходную таварыскую дапамогу ў найбольш слабых месцах, падрыхтаваць іх да іспытаў — такая была задача. І рэзультаты гэтай стараннай падрыхтоўкі выявіліся на іспытах.

Паказальнікі іспытаў нядрэнныя. У дзесятым «А» класе па беларускай дыктоўцы няма ні адной нават пасрэднай адзнакі, ужо не гаворачы аб дрэннай. У дзесятым «Б» — толькі адно «пасрэдна».

Такія-ж высокія паказальнікі пісьмовых і вусных адказаў па літаратуры (у 8-х класах па матэматыцы пісьмовай і вуснай таксама нядрэнныя ацэнкі). Большасць вучняў адказваюць на «выдатна» і «добра».

Горш абстаіць справа з іспытамі па рускай мове ў шостых класах. Тут ёсць ужо ацэнкі «дрэнна».

Нельга абыйсці такое пытанне, як «аператыўнае» кіраўніцтва з боку Віцебскага аблана. Тэксты дыктовак аблана прыслаў розныя як па сваёй трудназдольнасці, так і па колькасці слоў. У адной дыктоўцы 256 слоў, а ў другой —213. Прычым, тэкст аўтара скажон, перафразіраван, што значна затрудняе работу па правядзенню іспытаў. Пісьмовыя работы па алгебры і геаметрыі ў паралельных класах аблана ўказаў праводзіць адначасова таму, што адзін тэкст. Але як праводзіць адначасова, калі толькі адзін настаўнік?

Усё гэта толькі ўскладняе работу па нармальнаму правядзенню іспытаў у школе. Органам народнай асветы трэба ўлічыць гэта і на-хаду выпраўляць недахопы ў правядзенні праверачных іспытаў у школах.

С. КАЖДАН,
загадчык навучальнай часткі Коханаўскай сярэдняй школы.

У ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ НЕ ЗАХОЎВАЮЦЬ СОВЕЦКІЯ ЗАКОНЫ

У СССР — адзінай у свеце дзяржаве рабочых і сялян, — назаўсёды знішчана эксплуатацыя чалавека чалавекам і ўстаноўлен соцыялістычны лад. Перамогі, завяваныя пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і яе правадыроў Леніна і Сталіна, замацаваны ў найвялікшым гістарычным дакументе — Сталінскай Канстытуцыі — асноўным законе нашага грамадства. Святым абавязкам кожнага з членаў гэтага грамадства з'яўляецца захаванне Канстытуцыі, захаванне совецкіх законаў, умацаванне соцыялістычнай законнасці.

Няма чаго даказваць, што совецкія арганізацыі на месцах павінны паказваць прыклад захавання совецкіх законаў. Аднак, асобныя кіраўнікі, работнікі совецкіх органаў Палескай вобласці і ў прыватнасці Оргкамітэта Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, у практыцы сваёй работы недастаткова займаюцца ўмацаваннем соцыялістычнай законнасці, а ў радзе выпадкаў самі дапускаюць скажэнні яе. Прывядзем прыклады.

На аснове закона ўсякае змяненне ў землекарыстанні калгасаў праводзіцца толькі з дазволу ўрада. Аднак Оргкамітэт Вярхоўнага Совета БССР па Палескай вобласці гэтыя правы прысвоіў сабе. Так, напрыклад, самастойна із'ята 118 98 гектара зямлі калгасаў, адпаасобнікаў і лесгаса Мазырскага раёна для патрэб дарожна-будаўнічага ўчастка № 6—7. Падобныя факты не адзінкавы.

23 снежня 1938 г. Оргкамітэт вынес пастанову, згодна якой усе арганізацыі, а таксама прыватныя асобы, маючыя вымяральныя прыборы, павінны прадставіць іх на праверку і кляйменне дзяржаўнаму паверыцелю мер і вагаў, інакш — накладаецца адміністратыўнае спагнанне. Гэта супярэчыць пастанове ЦВК Саюза ССР ад 9 верасня 1934 г., дзе ўказана, што кляйменню належаць толькі вымяральныя прыборы, якія знаходзяцца ў карыстанні (а не проста ў пяўнасці) і толькі абагуленага сектара (а не прыватных асоб). На аснове няправільнай пастановы Оргкамітэта начальнікам Даманавіцкай раймілыцыі тав. Маславым у студзені г.г. было аштрафавана 8 калгаснікаў па 150 рублёў кожны, а ўчастковым інспектарам тав. Чэчко, наперакор крымінальна-працэсуальнаму кодэксу БССР, адабраны ад іх падпіскі аб нявыездзе.

Оргкамітэт незаконна зацвярджаў пастановы райвыканкомаў аб пераіменаванні населеных пунктаў, калгасаў, вуліц, а таксама аб прысваенні ім імён правадыроў партыі і ўрада, між тым, як такія пастановы павінны зацвярджацца ўрадам.

Мазырскім горсоветам і некаторымі райвыканкомамі выдаваліся абавязковыя пастановы па пытаннях, не ўваходзячых у іх кампетэнцыю.

Так, пастановай № 5 Мазырскага горсовета «Аб барацьбе з паводкай», выданай у 1938 годзе, абвешчана мабілізацыя ўсяго працоўнага насельніцтва гор. Мазыра на ахову мастоў, дамб і матэрыялаў.

Некаторыя пастановы падобны анекдоту. 10 сакавіка 1939 года Хойніцкі райвыканком вынес пастанову «Аб процідажджэвай ахове», у якой калгасам, соўгасам і прадпрыемствам забаронена наймаць вартаўнікоў... старэй за 40 год.

Мазырскі горсовет 15 снежня 1938 года вынес абавязковую пастанову, у якой устаноўлен штраф да 100 рублёў за неачыстку ад снегу і ільду маставых і тратуараў, а таксама за невывазку снегу з цэнтральных вуліц (а з якіх іменна не ўказана); у той-жа час забаронена ачышчаць ад снегу і ільду тратуары і маставыя ломамі, тапарамі, кіркамі і іншымі вострымі прадметамі. Якімі-ж нявострымі прадметамі можна ачышчаць лёд?

15 мая 1938 года Мазырскім горсоветам была прынята пастанова, у якой прапанавана горміліцыі на працягу аднаго дня знішчыць усіх бродзячых сабак адной з вуліц (Свідоўкі).

Соцыялістычная дэмакратыя ў рабоце раду выканаўчых камітэтаў і советаў Палескай вобласці таксама груба нарушаецца. У пасяджэннях прэзідыумаў і пленумаў, як правіла, прымае ўдзел не больш палавіны іх членаў.

Каля палавіны пасяджэнняў прэзідыума Мазырскага горсовета праходзіла пры ўдзеле 3-х членаў прэзідыума, пры саставе апошняга ў 7 чалавек. З наяўных 123 дэпутатаў горсовета на пленумах прысутнічае не больш адной трэці.

Устаноўлена, што адміністратыўныя спагнанні (штрафы) ў радзе выпадкаў накладваюцца незаконна, а часам зусім не накладваюцца за нарушэнне законных пастаноў. Практыкавалася накладанне штрафаў на грамадзян асабіста старшынёй або сакратаром адміністратыўнай камісіі. Сакратар адміністратыўнай камісіі пры Мазырскім горсавеце т. Лубінскі сам аштрафаваў 17 лютага 1939 года на 115 рублёў 4 грамадзян і пераслаў ім копіі пастаноў аб гэтым, і толькі 5 сакавіка гэтыя штрафы былі афармлены пратаколам адміністратыўнай камісіі.

Органы пракуратуры раду раёнаў Палескай вобласці дрэнна ажыццяўляюць нагляд за захаваннем соцыялістычнай законнасці. Абласная пракуратура, напрыклад, пачала ажыццяўляць агульны нагляд толькі з снежня 1938 года. Але сваю работу яна зводзіць да механічнага апратэставання асобных пастаноў, загадаў.

За час работы аддзела агульнага нагляду абласной пракуратуры апратэставана па вобласці 1055 незаконных пастаноў і рашэнняў: аб незаконных дзеяннях адміністратыўных камісій, калі штрафы накладваліся па сканчэнні двухмесячнага тэрміну, пры адсутнасці абавязковай пастановы (Парыцкі раён); пры адсутнасці ў пратаколах подпісу саміх нарушальнікаў (Жыткавіцкі раён); аб незаконных дзеяннях праўленняў калгасаў — масавым накладанні ўсемагчымых штрафаў без рашэння сельскага суда (Парыцкі, Петрыкаўскі і інш. раёны); аб увядзенні дзяжурстваў калгаснікаў і аднаасобнікаў у сельсоветах (Парыцкі раён) і т. д.

Не гледзячы на наяўнасць шматлікіх сігналаў, абласная пракуратура ні разу не паставіла аб гэтым пытанні ў Оргкамітэце Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па Палескай вобласці, не прыняла мер да папярэджання паўтарэння выяўленых нарушэнняў законаў.

Соцыялістычная законнасць і права ў нашай краіне ўзняты на небывалую вышыню. Яны стаяць на варце соцыялістычнай дзяржавы, соцыялістычнай сістэмы гаспадаркі, соцыялістычнай уласнасці. Яны ахоўваюць асабістыя правы і інтарэсы совецкіх грамадзян. Совецкія арганізацыі павінны паказваць прыклад дакладнага захавання законаў. Органы пракуратуры абавязаны ўзмацніць нагляд за іх выкананнем.

П. А. САНТАРОВІЧ,
кантралёр упаўн. КСК пры СНК СССР па БССР.

АДПУШЧАНЫЯ СРОДКІ НЕ СКАРЫСТОЎВАЮЦЦА

(АГЛЯД ПІСЕМ)

У рэдакцыю газеты «Звязда» штодзённа паступаюць сігналы аб тым, што не ва ўсіх раёнах своечасова адпускаюцца і асвайваюцца асігнаваныя сродкі на рамонт школ.

«Доўгамохская няпоўная сярэдняя школа ў Чавускім раёне, згодна зацверджанага бюджэта, піша т. Казлоў Т. М., павінна зрасходаваць у 1939 г. на рамонт і абсталяванне школы 23 тысячы рублёў, але сельсовет гэтых сродкаў не адпускае. У гэтым годзе неабходна дабудаваць класныя памяшканні. Для гэтай мэты быў куплен дом. Старшыня-ж сельсовета катэгарычна заявіў, што для прыстасавання гэтага будынка пад школу няма грошай».

Дырэктар Забалоцкай НСШ (Мсціслаўскі раён) тав. Бакшанскі ў сваім пісьме піша: «Школа змяшчаецца ў пяці дамах. Два з іх зусім непрыгодныя, у крайнім выпадку, патрабуюць капітальнага рамонту. Дзе дастаць грошы, каб зрабіць рамонт — невядома, бо сельсовет яшчэ не разлічыўся з рабочымі за зроблены рамонт у 1938 годзе. Адпушчаныя-ж грошы на 1938 год, па віне сельсовета, асталіся нескарыстанымі.

Грамадзяне Войтаўскага сельсовета, Суражскага раёна, вынеслі рашэнне скарыстаць частку сродкаў з самаабкладання на абсталяванне двух школ — Юдзінскай і Манулкаўскай. Што-ж атрымалася? Сельсовет, у першую чаргу, піша дырэктар Юдзінскай школы тав. Парфанаў, рашыў на гэтыя сродкі зрабіць рамонт памяшкання сельсовета, на што было заграчана 2500 рублёў, тады як ніякай патрэбы ў гэтым рамонце не адчувалася. Апрача таго частку паступаючых грошай сельсовет скарыстаў на іншыя патрэбы.

Неабходна за перыяд канікул падрыхтаваць памяшканні і абсталяванне школ. Сельсоветы абавязаны несці за гэту работу поўную адказнасць.

ІСПАНІЯ—ІТАЛЬЯНСКІ ПЛАЦДАРМ СУПРОЦЬ ФРАНЦЫІ

РЫМ, 9 чэрвеня. (ТАСС). У сувязі з прабываннем у Італіі Суньера, міністра ўнутраных спраў урада Франко, італьянскія газеты ўсяк стараюцца падкрэсліць агульнасць палітычных і ваенных мэт Італіі і Іспаніі, заяўляючы аб «неабходнасці расшырэння ўзаемнага супрацоўніцтва» паміж генералам Франко і фашысцкай Італіяй. Газета «Роста дэль Карліно» піша: «Хутка наступіць дзень, калі старшыня французскага совета міністраў Даладзе павінен будзе заявіць у палаце дэпутатаў, што, не гледзячы на яго ружовыя надзеі, калі наступіць вайна, то з пірэнейскай граніцы нельга будзе зняць ні войскі, ні ўзбраенняў. Іспанія становіцца побач з дзяржавамі «осі Рым—Берлін». Мы ніколі не сумняваліся ў тым, што граніца краін «осі» праходзіць таксама і па Пірэнеях».

Газета «Трыбуна» заяўляе, што «шлях Іспаніі канчаткова выбран» і што ён вызначаецца «мінулай барацьбой сумесна з італьянскімі легіянерамі і германскімі салдатамі».

Вельмі пераканаўчым доказам толькі частковай эвакуацыі італьянскіх салдат з Іспаніі з'яўляецца змест артыкула ў афіцыёзным італьянскім журнале «Форце армаце» («Узброеныя сілы»). Артыкул заяўляе, што італьянскі ваенны флот перавёз у Іспанію толькі за перыяд з сярэдзіны снежня 1936 года да сярэдзіны красавіка 1937 года, г. зн. на працягу 4 месяцаў, 100 тысяч салдат, 4370 аўтамабіляў і танкаў, 40 тысяч тон ваенных матэрыялаў, 750 артылерыйскіх гармат і т. д.

Такім чынам, 20 тысяч чалавек, эвакуіраваныя гэтымі днямі з Іспаніі, складаюць толькі невялікую частку адпраўленых у Іспанію італьянскіх салдат.

АРТЫКУЛ ЧЭРЧЫЛЯ

ЛОНДАН, 8 чэрвеня. (ТАСС). «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост» змяшчае артыкул Чэрчыля, у якім ён выражае задавальненне тым, што грамадская думка ў Англіі і Францыі даволі быстра прышла да заключэння, што неабходзен тройственны пакт з СССР. Ёсць глыбокая ўпэўненасць, піша Чэрчыль, што вакол падобнага тройственага пакта можна стварыць такі буйны блок узброеных дзяржаў, які прымусіць дыктатараў доўга і сур'ёзна падумаць, перш чым прадпрыняць акт агрэсіі.

Чэрчыль лічыць, што СССР не менш зацікаўлен, чым заходнія дзяржавы ў стварэнні такога блока па наступных меркаваннях:

1) З'яўленне германскай флатыліі на Чорным моры прадстаўляла-б пагрозу для СССР. 2) Германская пагроза Украіне і Польшчы. 3) Утаржэнне германскіх фашыстаў у балтыйскія дзяржавы або Фінляндыю прымусіла-б СССР, нават калі-б ён аставаўся адным, аднавіць войны Петра Вялікага. Справы цяпер зайшлі так далёка, піша Чэрчыль, што цяжка сабе нават уявіць, каб які-небудзь з трох урадаў узяў-бы на сябе адказнасць за пазбаўленне соцень мільёнаў працоўных гэтай сумеснай гарантыі іх жыцця і працэса. Чэрчыль піша, што ён не змяніў сваіх поглядаў адносна комунізма, але з самага пачатку ён аддаваў перавагу совецкім прапановам перад брытанскімі або французскімі. Яны просты, яны лагічны і яны адпавядаюць асноўным інтарэсам зацікаўленых дзяржаў, гаворыць Чэрчыль. Калі вывучыць мяркуемы блок міру са стратэгічнага пункту гледжання, то можна толькі радавацца таму, што пазіцыя Вялікабрытаніі ў Паўднёва-Ўсходняй Еўропе будзе, дзякуючы гэтаму блоку, значна мацней, чым у 1914 годзе.

Чэрчыль лічыць, што не павінна быць ніякіх сур'ёзных затрудненняў у пытанні аб гарантыях для балтыйскіх дзяржаў і Фінляндыі. «Патрабаванне рускіх, каб гэтыя дзяржавы былі-б уключаны ў тройственую гарантыю, добра абгрунтавана».

ІТАЛІЯ І АНГЛІЯ

ЛОНДАН, 9 чэрвеня. (ТАСС). Дыпламатычны агляднальнік газеты «Дэйлі геральд» піша, што, па некаторых даных, можна меркаваць аб намеры Мусаліні разарваць англа-італьянскае пагадненне. Чыано схілен пайсці насустрач берлінскім пажаданням у гэтым напрамку і інспірыруе кампанію ў друку ў карысць разрыву гэтага пагаднення.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У правінцыі Хубэй, на захад ад Ханькоу, японская калона, якая прасоўвалася ў заходнім напрамку з Цяньцзяна, затрымана кітайскімі войскамі.

На паўночны захад ад Ханькоу, у 35 кілометрах на поўдзень ад Аньлу, кітайскія войскі вядуць актыўнае наступленне. Праціўнік нясе вялікія страты.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У заходняй частцы правінцыі Шаньсі днямі кітайскі атрад атакаваў горад Фыньсі. Уварваўшыся ў горад, атрад уступіў у рукапашную схватку з японцамі, якія панеслі сур'ёзныя страты. У сувязі з прыбыццём буйных японскіх падмацаванняў кітайскі атрад пакінуў горад.

У правінцыі Хэбэй 31 мая кітайскія партызаны ўварваліся ў Мыньтоугоу (на захад ад Бэйпіна). Пасля вулічнага бою партызаны, захваціўшы з сабой зброю, адбітую ў японцаў, пакінулі горад. Апасаючыся паўтарэння партызанскіх налётаў, японскае камандаванне 1 чэрвеня перакінула з Бэйпіна ў Маньтоугоў атрад у 300 чалавек. Атрад нарваўся на засаду кітайскіх партызан і, не дасягнуўшы горада, у беспарадку адступіў, страціўшы многа забітымі і раненымі.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

7 чэрвеня атрад кітайскіх партызан уварваўся ў Кантон. Паміж атрадам і японскімі салдатамі адбылася схватка, пасля якой партызаны, захваціўшы адбітую ў японцаў зброю, ушлі з горада.

На поўдзень ад Кантона баі адбываюцца ў раёне Цзянмынь і на шасе Сіньхой-Фошань. 6 чэрвеня чатыры японскія самалёты зрабілі налёт на кітайскія пазіцыі паблізу Сіньхоя. Кітайскімі зенітнымі гарматамі адзін з японскіх самалётаў быў збіт.

На востраве Хайнань прадаўжаюць весці актыўныя аперацыі кітайскія партызаны. Днямі каля Чайцзі (на поўдзень ад Хуэйтуна) партызаны зрабілі засаду японскаму атраду і поўнасцю яго знішчылі.

РАШЭННЕ АБ АРЫШЦЕ ВАН ЦЗІН-ВЕЯ

ЧУНЦЫН, 9 чэрвеня. (ТАСС). У адрас кітайскага ўрада прадаўжаюць паступаць ад розных арганізацый і палітычных дзеячоў Кітая сотні тэлеграм з патрабаваннем арышта здрадніка Ван Цзін-вея. Улічваючы гэта, вярхоўны совет нацыянальнай абароны Кітая прыняў рашэнне аб арышце Ван Цзін-вея.

НЕВЫЧАРПАЛЬНА СКАРБНІЦА НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

Музыкальныя курсы для дарослых пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі існуюць нядаўна — усяго трэці год. На іх займаюцца людзі розных прафесій і спецыяльнасцей. Вучоба праходзіць без адрыву ад вытворчасці.

На курсах ёсць розныя класы: скрыпкі, народных інструментаў, фортэпіяна, вакальны клас і іншыя. Адначасова існуе група па падрыхтоўцы кіраўнікоў хора. За час свайго існавання курсы прарабілі вялікую работу, дабіліся значных поспехаў.

Днямі ў кансерваторыі адбыўся канцэрт слухачоў гэтых курсаў. Удзельнікі канцэрта дэманстравалі свае дасягненні ў галіне авалодання складанай тэхнікай музыкальнага і вакальнага майстэрства.

Рабочы стругаль менскага скурзавода «Большэвік» тав. Бенгіс тэмпераментна і з пачуццём выканаў на скрыпцы «Ларгетто» Гендзеля і «Гавот» Госэка. Няхай у паасобных месцах выканання т. Бенгіса адчувалася тэхнічная недаапрацоўка, але сам факт выканання такіх складаных твораў — сведчанне несумненнага росту рабочага-музыканта. Гэтае-ж самае можна сказаць і аб таварышу Гольдману (ваеннаслужачы)—выканаўцу на трамбоне п'есы № 11 Гофмана, т. Казюліч (былая лабарантка Трэста зялёных насаджэнняў)—выканаўцы аднаго з твораў Шуберта і інш.

З выкананнем вакальных нумароў выступілі курсанты: тт. Бакшт — інструментальшчык друкарні імені Сталіна, Васільева — хатняя гаспадыня, Шічугін — ваенветурач, Селязнёва—загадчыца бібліятэкі першай менскай школы, Дзянісаў —ваеннаслужачы, Ніціеўскі і іншыя. Яны добра выконвалі творы класічнай музыкі і творы совецкіх кампазітараў: песню варажскага госця з оперы «Садко» Рымскага-Корсакава, арыю Антаніды з оперы «Іван Сусанін» Глінкі і інш. Цёпла сустрэў глядач дуэт Карася і Адаркі з оперы «Запарожац за Дунаем» Арцэмоўскага ў выкананні тт. Караневіча і Селязнёвай.

Трэба адзначыць, што таварышы павінны яшчэ многа працаваць над авалоданнем складанейшага вакальнага майстэрства, над павышэннем культуры мовы, выразнасці перадачы музыкальнага твора.

Нельга не адзначыць такі факт. На курсах займаецца 50-гадовы слухач, тав. Фабрыкант, былы ўпаўнаважаны па распаўсюджванню друку. У мінулым бядняк, ён толькі пры совецкай уладзе пазнаў сапраўднае шчаслівае жыццё.

Тав. Фабрыкант займаецца ў групе кіраўнікоў хораў. За час сваёй вучобы ён непазнавальна вырас. Нядаўна т. Фабрыкант напісаў уласную музыку на яўрэйскую песню (словы Сары Каган). Гэту песню выканаў на канцэрце т. Далжанскі.

Канцэрт паказаў, наколькі невычарпальна скарбніца народных талентаў шчаслівага беларускага народа. Я. Ш.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ РЭЖЫСУРЫ

14 чэрвеня ў Маскве пры Камітэце па справах мастацтваў склікаецца Усесаюзная нарада па пытаннях совецкай тэатральнай рэжысуры. На нарадзе будуць прысутнічаць буйнейшыя майстры рэжысуры СССР, народныя артысты, прадстаўнікі тэатральнага мастацтва нацыянальных рэспублік.

З БССР на нараду паедуць тт. Озірскі, Юдэлевіч (Упраўленне па справах мастацтваў), рэжысёры, заслужаныя артысты БССР Рахленка, Літвінаў, Міровіч, і рэжысёры тт. Галаўчынер (Яўрэйскі дзяржаўны тэатр), Пацехін і Данілаў.



Вядомы ў Беларусі сталяр-мазаік, калгаснік сельгасарцелі «Чырвонаармеец», Магілеўская раёна, т. Я. С. Арлоў разам з калгаснікамі тт. Вольскім і Шубадзёравым закончыў новую арыгінальную работу—пісьмовы стол, зроблены з 18 парод каляровага дрэва. Гэтая работа — выдатны ўзор народнай творчасці. Стол складаецца з 184 тысяч кавалачкаў дрэва. Яшчыкі адкрываюцца і замыкаюцца без замка і ключа, шляхам спецыяльнага ўстройства, сканструяванага тав. Арловым. На верхняй крышцы стала надпіс: «Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну ад беларускага народа». НА ЗДЫМКУ: стол работы майстра Арлова і тт. Вольскага і Шубадзёрава. Фото Я. Салавейчыка.

ЗАКОНЧЫЛІСЯ ВУЧЭННІ ПА ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЕ МЕНСКА

Ноч з 8 на 9 чэрвеня была «трывожнай». Менск быў на «пагражаючым» становішчы. З моманту на момант авіяцыя «праціўніка» магла паўтарыць налёт на горад. Увесь час на аб'ектах ля тэлефонаў сядзелі дзяжурныя. Каманды асоавіяхімаўскіх падраздзяленняў і групы самаабароны знаходзіліся ў баявой гатоўнасці. Прыняты меры светамаскіроўкі. Сталіца рыхтавалася да процівапаветранай абароны.

Ноч прайшла спакойна. Самалёты «праціўніка» не паяўляліся. Стала ясна, што «праціўнік» накаплівае сілы і рыхтуецца да паветранага нападу на горад.

Раніцай у11 гадзін 35 мінут стала ядома, што на вялікай вышыні эскадрылля скарасных бамбардыроўшчыкаў «праціўніка» накіроўваецца на Менск. Насустрач ім у паветра падняліся знішчальнікі. Самалёты «праціўніка» на гэты раз уйсці не змаглі і на подступах да горада вымушаны былі прыняць бой, у часе якога было збіта чатыры самалёты «праціўніка». Інтэнсіўную барацьбу вяла таксама зенітная артылерыя, якая збіла тры самалёты.

Некалькім бамбардыроўшчыкам «праціўніка» ўсё-ж удалося прарвацца і яны ў беспарадачным строю імкліва пранесліся над горадам, скінуўшы ў раёнах Лагойскага, Барыкаўскага і Чэрвеньскага шасе некалькі «бомб». Сіламі каманд мясцовай процівапаветранай і хімічнай абароны вынікі бамбардыроўкі былі хутка ліквідаваны.

Вечарам у 23 гадзіны 15 самалётаў «праціўніка» зноў прабавалі зрабіць налёт на Менск. Прарвацца ўдалося толькі 5 самалётам, якія скінулі «бомбы» на вуліцах горада.

Позна ноччу з 9 на 10 чэрвеня быў дан адбой. Вучэнні па процівапаветранай і хімічнай абароне горада закончыліся.

Апыленне малярыйных ачагоў з самалётаў

У БССР, асабліва на Палессі, з поспехам ідзе работа па ліквідацыі малярыйных ачагоў. Да гэтай справы прыцягнута авіяцыя. Нядаўна закончыўся першы тур авіяапылення вадаёмаў, заражоных лічынкамі малярыйных камароў, у Палескай і Гомельскай абласцях. Была ахоплена тэрыторыя ў 12.000 гектараў, у тым ліку раёны, прылягаючыя да торфзаводаў «Большэвік», «Шлях социялізма», «Давыдаўка». З чэрвеня ў гэтых-жа абласцях пачаўся другі тур. Авіяапыленне праводзіцца з двух самалётаў грамадзянскага паветранага флота пілотамі тт. Антохіным і Раманавым. У зоне апылення сярод насельніцтва рэзка знізілася колькасць захворванняў малярыяй.

Адначасова праводзіцца і рад іншых прафілактычных мерапрыемстваў. Пачата заліта забалочаных месц нафтаю. Будзе заліта да 1.000 гектараў. З Украіны ўпершыню завозіцца ў БССР гамбузія — рыбка, паядаючая лічынкі камара. Гамбузія будзе развозіцца ў вадаёмах Палескай і Гомельскай абласцей.

У даны момант у БССР працуюць 4 малярыйныя станцыі — у Гомелі, Мазыры, Тураве і Бабруйску і 43 процімалярыйныя пункты і кабінеты пры паліклініках і амбулаторыях. Для работы на гэтых пунктах падрыхтавана да 400 хінізатараў і 150 боніфікатараў.

НОВЫ ПРАЦЯЖНЫ СТАНОК „ДУПЛЕКС"

Калектыў канструктарскага бюро менскага станкабудаўнічага завода імені Кірава заканчвае распрацоўку рабочых чарцяжоў новага гарызантальна-працяжнога 10-тоннага станка «Дуплекс» з гідраўлічнай падачай. Гэты станок распрацаван на базе выпускаемых заводам працяжных станкоў.

Новы станок павялічыць прадукцыйнасць працы ў 2 разы і дасць магчымасць апрацоўваць паралельна дзве дэталі розных размераў.

Станкі гэтага тыпу ў СССР будуць вырабляцца ўпершыню. Над праектаваннем станка працуюць інжынеры тт. Шлапакоў, Марон, тэхнікі Галко і Язгур. К канцу бягучага года завод выпусціць першыя два станкі. (БЕЛТА).

ПЕРАМОЖЦЫ СПАБОРНІЦТВАЎ ПА БОКСУ

З 7 па 9 чэрвеня ў менскім клубе імені Сталіна адбываліся ўсесаюзныя спаборніцтвы па боксу на асабістае пяршынства спартыўнага таварыства «Молния». У матчах на рынгу сустрэліся 18 мацнейшых баксёраў Ленінграда, Растова-на-Дану і Менска. Першыя месцы ў розных вагавых катэгорыях занялі чэмпіёны БССР 1939 года па боксу т. Цырлін, Рубін і Румянцаў, баксёры Лук'янаў і Лось (Менск), Віцеўскі і Сцепаненка (Растоў-на-Дану). Пераможцы ўзнагароджаны жэтонамі Цэнтральнага Совета таварыства «Молния».

ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТ БССР

⊙ У гомельскім Доме партасветы адкрыта выстаўка, прысвечаная вялікаму украінскаму паэту Тарасу Грыгор'евічу Шэўчэнка. На выстаўцы прадстаўлена значная колькасць матэрыялаў, якія характарызуюць жыццё і дзейнасць вялікага песняра украінскага народа. («Гомельская праўда»).

⊙ У Слуцкім раёне радыёфікавана 326 дамоў калгаснікаў. У бягучым годзе радыёфікуюцца дамы калгаснікаў сельскагаспадарчых арцелей «Рухавік» і «Ленінскі шлях», дзе будзе ўстаноўлена 200 радыёкропак. («За социялістычную радзіму»).

⊙ Закончылі вучобу ў Магілеве на курсах жанчын памочнікаў-машыністаў 21 чалавек. Многія з іх днямі выязджаюць у першы рэйс. («Железнодорожник Белоруссии»).

⊙ Мозыр наведаў ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі БАВА. Канцэрты прайшлі з вялікім поспехам. («Большэвік Палесся»).

⊙ Вечар хатніх гаспадынь адбыўся ў дрысенскім Доме социялістычнай культуры. Больш 300 жанчын праслухалі даклад аб міжнародным становішчы. Перад прысутнымі выступіў мясцовы ансамбль песні і пляскі. («Віцебскі рабочы»).

Астаюцца на звыштэрміновую службу ў РККА

Натхнёныя рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б) і Трэцяй Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, лепшыя байцы і камандзіры Н-скай часці БАВА падаюць дакладныя аб астаўленні іх на звыштэрміновую службу ў радах РСЧА. Дакладныя падалі малодшыя камандзіры: Цырульнікаў, Раманаў, Чэрнышэў, Шамаеў, Самойлаў, Лагуноў, баецвыдатнік Кулаеў і іншыя.

У сваіх дакладных байцы і камандзіры пішуць, што гатовы ў любую мінуту выступіць на абарону сваёй квітнеючай радзімы і бязлітасна біць ворага, не шкадуючы ні сваіх сіл, ні самога жыцця. (БЕЛТА).

ЗАВОДЫ БЕЛТОРФА ЗА 8 ЧЭРВЕНЯ

	План	Здадыта	% плана
Асінторф	4.456	4.610	103,5
Чырвоны сцяг	848	898	105,9
Імені Орджанікідзе	2.076	2.360	113,7
Імені Даумана	272	206	75,7
Свабода	544	332	61,0
Лукская	390	491	125,9
Дукора	396	460	116,2
Татарка	554	570	102,9
Радзічава	166	94	56,6
Міханавічы	272	326	119,9
УСЯГО	9.974	10.347	103,7

ДЗЁННІК

Сёння, у 7 гадзін вечара, у пакоі № 18 Дома партактыва адбудзецца кансультацыя на тэму «Як працаваць над кнігай» (складанне плана, канспектаў і тэзісаў).

Кансультант дацэнт Зеленоў.

Менскае лектарскае бюро павядамляе, што 12 чэрвеня г. г. у Менск прыязджае начальнік спартыўнай авіяцыі Асоавіяхіма СССР тав. Я. Д. Машкоўскі, які прачытае рад лекцый на тэмы:

1. Дасягненні совецкай авіяцыі.
2. Завадзёры Паўночнага полюса.
3. Беспасадачны пералёт Кокінакі і Гардзіенка Масква — Злучаныя Штаты Амерыкі.

Арганізацыі, якія жадаюць правесці гэтыя лекцыі, павінны хаць свае заяўкі. Адрас: Дом партактыва, лектарскае бюро.

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

Гастролі Дзяржаўнага Рускага тэатра музыкальнай камедыі БССР (Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра БССР)

10 чэрвеня «РОЗ-МАРИ»

Пачатак у 8 г. веч. Білеты ў касе тэатра з 11—2 і з 5 г. веч.

ДЗЯРЖЦЫРК

СЁННЯ і штодзённа

ГАСТРОЛІ буйнейшага атракцыёна КІТАЙСКІ НАРОДНЫ ЦЫРК.

20 ВАН-Ю-ЛІ 20

Удзельнічае ўся трупа. Пачатак ў 9 гадзін вечара.

Каса адкрыта з 12 да 2 г. і з 5 г. веч.

Каса ў Доме ўрада адкрыта штодзённа з 12 да 5 гадзін веч.

Кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ЧАЛАВЕК У ФУТЛЯРЫ

Кінатэатр «РОДИНА» ІШОЎ САЛДАТ З ФРОНТА

Кінатэатр «Парыжская комуна» (Пушкіна, 64) МЫ З КРАНШТАТА

Кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕТРА ВІНАГРАДАВА

Дзіцячы кінатэатр ЛЕНІН У 1918 ГОДЗЕ

Кінатэатр «СПАРТАК» ТРЫНАЦЦАЦЬ

Кінатэатр «НАВІНЫ ДНЯ».

1. ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ
2. Журнал Маскоўскай студыі кінохронікі № 46.
3. У былым гнязде мракабесся.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР (памяшк. Белдзяржфілармтэатра)

12 і 13 чэрвеня КАНЦЭРТЫ

саліста Маскоўскага ордэна Леніна Акадэмічнага Вялікага тэатра СССР

Д. Г. Бадрыдзе

пры ўдзеле артысткі Маскоўскага ордэна Леніна Малага тэатра Варвары ОБУХОВАЙ

Пачатак у 9 гадз. вечара. Білеты ў касе тэатра і ў магазіне Сангітіены (рог Ленінскай і Совецкай) з 8 г. дня.

Білеты, купленыя на 5 чэрвеня, сапраўдны на 12 чэрвеня; білеты, купленыя на 6 чэрвеня, сапраўдны на 13 чэрвеня.

ЛУЖАСНЯНСКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ПАЛЯВОДЧЫ ТЭХНІКУМ

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ

НА 1939-40 ВУЧЭБНЫ ГОД НА 1 КУРС.

Тэхнікум рыхтуе агранамаў-паляводаў сярэдняй кваліфікацыі. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросце ад 15 да 30 год, з адукацыяй за няпоўную сярэднюю школу (7 класаў сярэдняй школы).

Паступаючыя трымаюць іспыты па наступных дысцыплінах: рускай мове і літаратуры, Канстытуцыі СССР, матэматыцы, фізіцы і фізічнай геаграфіі ў аб'ёме праграмы НСШ.

Асобы, якія скончылі НСШ і маюць ацэнку «выдатна» па рускай і беларускай мовах і літаратуры, матэматыцы, Канстытуцыі СССР, фізіцы і фізічнай геаграфіі, прымаюцца ў тэхнікум без іспытаў.

Прыём заяў да 10 жніўня. Іспыты з 15 па 25 жніўня.

Да заявы аб паступленні трэба прыкласці наступныя дакументы (у арыгіналах): аб адукацыі, аўтабіяграфію, метрыку, даведку аб стане здароўя, дзве завераныя фотакарткі і паштовых марак на 60 кап. Пры яўцы на іспыты неабходна мець пашпарт.

Усе прынятыя ў тэхнікум забяспечваюцца інтэрнатам, а таксама стыпендыяй на паспяховасці. Ёсць сталовая, лазня, пральня.

Пачатак заняткаў 1 верасня.

Заявы пасылаць па адрасу: г. Віцебск, Лужаснянскі с.-г. тэхнікум.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРЭЗІДЫУМ МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

склікае 10 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні клуба імені Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай вуліц)

АГУЛЬНАГАРАДСКІ СХОД

дырэктароў прадпрыемстваў, каменданта інтэрнатаў, старшынь дэпутацкіх груп на прадпрыемствах, старшынь фабзаўмясцкомаў, членаў Горсовета, секцый: жыллёвай, комунальнай і аховы здароўя, домаўпраўляючых, загадчыкаў магазінамі, сталовымі, грамадска-санітарных інспектароў, загадчыкаў медпунктамі і актыва РОКК.

Абвестка дня:

АБ ПРАВЯДЗЕННІ МЕСЯЧНІКА ПА БАРАЦЬБЕ З АНТЫСАНІТАРЫЯЙ У ГОРАДЗЕ.

Яўка ўсіх вышэйпералічаных асоб абавязкова.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

Дырэкцыя Дзяржаўнага вялікага тэатра оперы і балета

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА,

што АБАНЕМЕНТЫ з 96 нумара САПРАЎДНЫ ў другой палавіне сезона 1939 года, г. зн. са жніўня месяца г. г.

ДА ЎВАГІ

Калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў!

загатаўляйце

івавую, лазовую і яловую кару, ліпавы луб і бярэсту для скурана-абутковай прамысловасці.

ЗДЗІРКУ ЛАЗОВАЙ КАРЫ рабіце толькі з ссечанага хлыста, убірайце хлысты па ўказанню лесніка, каб захоўваць зараслі і не засмечваць лес.

ЯЛОВУЮ КАРУ ЗДЗІРАЙЦЕ з ссечанай яловай драўніны на лесаўчастках, калгасных, школьных і іншых будаўніцтвах.

Сушыце кару паветранай сушкай, лепш за ўсё пад навесам, а не на сонцапёку. Захоўвайце знятую кару ад дажджу, каб унікнуць пагоршання якасці кары.

ЗДАВАЙЦЕ КАРУ НА ОКЛАДЫ РАЙЗАГАЎ І СЕЛЬПО СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ, а таксама ЗАГОТПУНКТАМ БЕЛСКУРСНАВЗБЫТА, у любых колькасцях.

Цана на івавую кару павышана і ўстаноўлена ў 240 рублёў за тону сухой кары.

Цана за тону яловай кары ўстаноўлена ў 80 рублёў

ДОБРАЯ КАРА. ЛУБ І БЯРЭСТА — матэрыял для выпрацоўкі высокаякаснага абутку і інш. скураных вырабаў.

ЧАС ЗДЗІРКІ КАРЫ — ў перыяд руху соку, з 15 мая па 15 ліпеня. Лесарубачныя білеты можна атрымаць бясплатна ў лясніча-га або ў райлесгасе. БЕЛСКУРСНАВЗБЫТ.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

Ў МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ІНСТЫТУТ

НА 1939-40 ВУЧЭБНЫ ГОД.

У медыцынскі інстытут прымаюцца грамадзяне Саюза ССР абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 35 год з закончанай сярэдняй асветай (дзесяцігодка, рабфак, тэхнікум, вучылішча, сярэднія школы для дарослых, ваенныя школы — у абёме праграмы дзесяцігодкі), або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

Асобы, скончыўшыя да 1935 г. школу II ступені (дзевяцігодку), або скончыўшыя 3-гадовыя на базе сямігодкі прафесіянальныя школы ў БССР і УССР, дапускаюцца да прыёмных іспытаў нароўні са скончыўшымі сярэднюю школу.

Асобы, скончыўшыя тэхнікумы або вучылішчы, дапускаюцца да прыёмных іспытаў пры наяўнасці ў іх устаноўленага законам 3-гадовага вытворчага стажа; гэты стаж не патрабуецца ад асоб, уключаных у 5-проц. выпуск кожнага тэхнікума, згодна пастановы ЦВК і СНК ад 15 верасня 1933 г.

Асобы з нясканчанай вышэйшай асветай дапускаюцца да прыёмных іспытаў на агульных падставах.

Скончыўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) і маючыя атэстат выдатніка, а таксама скончыўшыя ў 1939 г. рабфак з адзнакай «выдатна» па ўсіх дысцыплінах, апрача чарчэння і маляванння, прымаюцца без прыёмных іспытаў. Гэта права распаўсюджваецца і на скончыўшых выдатна сярэднюю школу (дзесяцігодку) у парадку экстэрната.

Усе астатнія падвяргаюцца ўступным іспытам па беларускай і рускай мовах (пісьмовая работа, граматыка, літаратура), гісторыі народаў СССР і Канстытуцыі СССР, матэматыцы, фізіцы, хіміі і па адной з замежных моў — англійскай, нямецкай або французскай — па выбару паступаючага. Іспыты па беларускай і рускай мовах і матэматыцы — вусныя і пісьмовыя; па астатніх прадметах — толькі вусныя. Паўторныя іспыты не дапускаюцца. З ліку вытрымаўшых прыёмныя іспыты з адзнакамі не ніжэй «пасрэдна», прымаюцца ў інстытут асобы, атрымаўшыя найбольш вялікія адзнакі.

Прыём заяў з 20 чэрвеня па 1 жніўня. У заяве павінны быць паказаны выбраныя паступаючым факультэт і спецыяльнасць. Заявы падаюцца на імя дырэктара інстытута з прыкладзеннем наступных дакументаў: а) падрабязнай аўтабіяграфіі, б) атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (арыгінал), в) трох фотакартак (без галаўнога ўбора, пажадана размерам 3 х 4 см.) з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, завераных дзяржустановай, г) даведкі аб адносінах да ваеннай службы (для ваеннаабавязаных). Пашпарт прадъяўляецца асабіста.

Прыёмныя іспыты з 1 па 20 жніўня; залічэнне ў лік студэнтаў з 21 па 25 жніўня.

Скаргі на недапушчэнне да прыёмных іспытаў можна падаваць у Народны Камісарыят Аховы Здароўя БССР.

Да пачатку прыёмных іспытаў арганізаваны медыцынскі агляд усіх паступаючых.

Асобы, залічаныя ў інстытут, але без уважлівых прычын не прыступіўшыя да заняткаў з пачатку вучэбнага года, з ліку студэнтаў выключаюцца. Скаргі на адмову ў залічэнні ў інстытут можна падаваць да пачатку вучэбнага года ў Народны Камісарыят Аховы Здароўя БССР.

Інстытут прымае 300 чал. на лячэбны, 100 чал. на санітарна-гігіенічны і 100 чал. на пельнятрычны факультэты.

Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам ва ўстаноўленым парадку.

Дакументы пасылаць па адрасу: Менск, Універсітэцкі гарадок, анатамічны корпус, медыцынскі інстытут, прыёмная камісія. Тэл. 20-817.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ГРАМАДЗЯНЕ,

калі ў вас у доме ёсць лішнія аптэчныя шкляначкі і баначкі, здавайце іх за плату ў бліжэйшую аптэку

ПРЫЁМ ПАСУДЫ праводзіцца ва ўсіх аптэках, з аплатай па наступных цэнах:

Шкляначкі і банкі да 50 гр. — па 10 кап. за штуку.

Шкляначкі і банкі да 200 гр. — па 20 кап. за штуку.

ПАСУДА ПРЫМАЕЦЦА толькі мытая і чыстая.

Пры неабгрунтаваных адмовах ад прыёму вымытай пасуды аптэкамі, паведамляйце ў абласное Аптэкаўпраўленне па адрасу: г. Менск, вул. Горкага, 1.

БЕЛАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ.

Патрабуюцца

ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ, ШОФЕР І КУР'ЕР.

Звяртацца: Совецкая, 49, выдавецтва «Звязда», II паверх, пакой № 2.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

Уп. Галоўлітбела № Т—1305. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.